ТЭМА НУМАРА — СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ ІДЭАЛАГІЧНАЙ І ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ Ў БДУ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

30 лістапада 2004 года, № № 20-21 (1905-1906)

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Студэнт павінен быць шчаслівым

На пытанні "Беларускага універсітэта" адказвае прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях, кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Уладзімір Васільевіч СУВОРАЎ.

— На вашу думку, ці змяніўся за гады вашай працы ў БДУ універсітэцкі першакурснік?

— Я ва універсітэце з 1979 года. За гэтыя гады шмат працаваў з першакурснікамі. І не толькі як выкладчык, але і ў паходы іх вадзіў, сустракаўся ў пазавучэбны час, па меры магчымасці дапамагаў вырашаць ім праблемы. Гэтыя гады былі няпростымі для ўсёй нашай краіны. Але маладыя людзі, якія прыходзяць ва універсітэт, не мяняюцца ў сваёй сутнасці. Як і шмат гадоў таму, яны прыходзяць ва універсітэт па новыя веды, новы вопыт. Так сама, як і раней, яны арыентаваныя на поспех і прызнанне. Аднак уяўленне аб поспеху і ступень веры ў неабходнасць усяго таго, што ім тут прапаноўваецца, мабыць, адрозніваюцца.

— А што змянілася ў адукацыйна-выхаваўчым працэсе?

— Змяніліся мэты. Мяне бянтэжыць, калі галоўнай задачай універсітэта абвяшчаецца толькі падрыхтоўка спецыялістаў. Мне здаецца, гэта няправільна. У ПТВ, напрыклад, таксама рыхтуюць спецыялістаў. Універсітэцкая адукацыя перш за ўсё значна пашырае асобасны патэнцыял моладзі, стварае той базіс, на аснове якога яна будзе прагрэсіраваць усё астатняе жыццё. Не дарма кажуць, што адукацыя — гэта тое, што засталося, калі забыў усё, чаму цябе вучылі. Безумоўна, гэта жарт, але ў ім закладзены глыбокі сэнс.

Змяніліся ўяўленні пра сэнс навучання. Пры гэтым адной з распаўсюджаных супярэчнасцяў з'яўляюцца розныя ўяўленні пра сэнс навучання ў выкладчыкаў і студэнтаў.

Змянілася таксама размеркаванне адказнасці за вынік навучання. Тут цэнтр цяжару яўна перамясціўся на студэнта. Сёння запэўніванне выкладчыка накшталт "вучы, што я табе даю, і будзеш шчаслівым" ужо мала каго пераконваюць.

Разам з тым, легальныя магчымасці для самастойнага выбару адукацыйных стратэгій у студэнтаў пакуль што не вельмі вялікія. Гэтай супярэчнасці мы імкнемся пазбавіцца за кошт новай арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

І пакуль мы, педагогі, пра індывідуальныя адукацыйныя стратэгіі толькі спрачаемся, студэнты фактычна даўно ўжо іх выбудоўваюць. І гэтымі стратэгіямі яны адрозніваюцца. Яны наўмысна адны прадметы вучаць добра, другія — не вельмі, трэція зусім не вучаць, толькі здаюць, успрымаючы іх як лішнюю перашкоду на шляху да атрымання дыплома.

Безумоўна, у новых умовах студэнтам будзе патрэбная моцная сацыяльна-педагагічная падтрымка. Формы гэтай падтрымкі павінны стварацца ўжо цяпер, таксама як і навыкі працы ў новых умовах у студэнтаў.

— Як можна ахарактарызаваць асноўныя прынцыпы выхаваўчага працэсу ў БДУ?

— Я б вызначыў прынцып чалавечнасці, прынцып сучаснасці і прынцып дзяржаўнасці. Назвы гэтых прынцыпаў гавораць самі за сябе. Рэалізацыя гэтых прынцыпаў прадугледжвае павагу да традыцый, асобасны падыход, ініцыятыву і фарміраванне ўяўленняў пра грамадства і свой паспяховы шлях у ім. Галоўнай умовай паспяховасці рэалізацыі гэтых прынцыпаў я лічу валоданне сацыяльна-педагагічнымі тэхналогіямі, якія дазваляюць трансфармаваць выхаваўчае ўздзеянне ў перакананні студэнтаў. Я лічу, што перш за ўсё пры рабоце з калектывам трэба абапірацца не на тое, што людзей адрознівае адзін ад аднаго, а на тое, што ёсць у іх агульнага. У свой час мяне ўразіў артыкул акадэміка Успенскага пра прыроджаныя інстынкты. Гэта магутныя рычагі, якія заяўляюць пра сябе праз патрэбы. Любы чалавек, а тым больш малады, адчувае гэтыя патрэбы, часам перажывае літаральна фізічна, да болю. І адчуваючы гэтыя патрэбы, ён не можа не думаць пра тое, як іх задаволіць. Мы, выхавальнікі, можам і павінны ўплываць на тое, як чалавек уяўляе спосабы задавальнення сваіх патрэбаў, мы павінны прапаноўваць яму сацыяльна апраўданыя спосабы. Мы нават абавязаны спакушаць яго такімі спосабамі, адначасова адштурхоўваючы ад спосабаў, якія вядуць да дэвіянтных паводзінаў.

З улікам спецыфікі універсітэта першай па значнасці я б вылучыў патрэбу ў пазнанні, у кампетэнтнасці. Менавіта наяўнасць гэтай патрэбы ў студэнтаў дазваляе мне думаць, што яны хочуць вучыцца, хочуць быць кампетэнтнымі.

Разам з тым, студэнты, як і ўсе людзі, імкнуцца дасягнуць мэты з мінімумам намаганняў. Але канкрэтныя студэнты пад гэтым мінімумам разумеюць рознае. Калі адны нацэлены на тое, каб дамагчыся выніку за кошт "лоўкасці"

(Закончэнне на 3-й стар.)

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

У аснове ідэалогіі — рэальныя каштоўнасці

На пытанні газеты "Беларускі універсітэт" адказвае прарэктар па вучэбнай рабоце, старшыня Савета па ідэалогіі БДУ, доктар эканамічных навук прафесар Уладзімір Леанідавіч КЛЮНЯ.

— Вызначце, калі ласка, мэты ідэалагічнай работы ва універсітэце. Што ўяўляе з сябе сістэма ідэалагічнай работы ў БДУ і якія задачы вырашае Савет па ідэалогіі?

— Перш за ўсё варта адзначыць, што ў сучасных умовах актыўна фарміруецца дзяржаўная ідэалогія новага тыпу. У яе аснову пакладзены рэальныя каштоўнасці, абумоўленыя гістарычнымі традыцыямі беларускага народа, грамадска-палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі, прававымі і маральнымі нормамі, якія складаюцца ў незалежнай беларускай дзяржаве. Ідэалогія спрыяе фарміраванню і развіццю палітычнай свядомасці людзей, светапоглядных пазіцый і каштоўнасных арыенціраў. Ідэалогія павінна пранізваць усе сферы жыццядзейнасці грамадства, укараняцца ў свядомасць падрастаючага пакалення, кіраваць учынкамі грамадзян краіны, каб яны рабілі годны ўнёсак у яе развіццё, працавалі на агульную карысць. Гэтыя палажэнні і вызначаюць агульныя мэты ідэалагічнай работы ва універсітэце.

Разам з тым, адным з складнікаў ідэалогіі дзяржавы, што фарміруецца на нашых вачах і з нашым удзелам, з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў з унутранай патрыятычнай, гуманістычнай пазіцыяй, выхаванне ў любові і павазе да бацькоў і старэйшых, да сваёй навучальнай установы і роднага краю. Важна таксама ўсведамляць уласную запатрабаванасць у сваёй краіне, адказнасць за яе лёс і імкнуцца прынесці ёй максімальную карысць.

Таму падмуркам сістэмы ідэалагічнай работы ў БДУ выступае арганізацыя навучальнага працэсу, уцягнутасць студэнтаў у самастойнае атрыманне ведаў.

Выхаванне навукова-педагагічных кадраў, магістрантаў, аспірантаў, навучэнцаў з высокай культурай, грамадзянскай актыўнасцю, павагай да нацыянальных традыцый, з'яўляючыся адной з статутных задач Беларускага дзяржаўнага універсітэта, шмат у чым рэалізуецца і ў пазанавучальны час. Увесь гэты складаны і шматпланавы спектр ідэалагічнай работы ў БДУ і вызначае працу Савета па ідэалогіі. Савет створаны з мэтай каардынацыі дзейнасці структурных падраздзяленняў па ажыццяўленні ідэалагічнай работы ва універсітэце, з мэтай ажыццяўлення перспектыўнага планавання ідэалагічнай работы; разгляду рашэнняў па пытаннях арганізацыі і павышэння эфектыўнасці ідэалагічнай работы; распрацоўкі прапановаў і рэкамендацый па ўдасканальванні сістэмы ідэалагічнай работы, яе кадравым забеспячэнні і г.д. Гэта толькі частка задач, якія вырашае Савет па ідэалогіі.

— Якую ролю ў сістэме ідэалагічнай работы адыгрываюць грамадскія, пераважна маладзёжныя, арганізацыі, студэнцкі актыў?

— На сучасным этапе ідэалагічнай работы ў вышэйшай школе існуе аб'ектыўная неабходнасць значнага ўзмацнення ролі і ступені ўплыву маладзёжных арганізацый і студэнцкага актыву. Гэта таксама важны складнік сістэмы ідэалагічнай работы ў БДУ.

Праводзіцца вялікая праца па арганізацыі ідэалагічнай работы, маніторынгу яе эфектыўнасці і якасці сярод студэнцтва, навукова-даследчая работа па вывучэнні праблем студэнцкай моладзі, дынамікі каштоўнасных арыентацый навучэнцаў і студэнтаў. Значная ўвага з боку ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю, студгаградка, БРСМ, іншых студэнцкіх аб'яднанняў надаецца арганізацыі і правядзенню разнастайных семінараў, школаў, злётаў, навукова-практычных канферэнцый, акцый, афармленню інфармацыйных і тэматычных стэндаў, правядзенню сустрэч з кіраўнікамі органаў дзяржаўнага кіравання, прадстаўнікамі заканадаўчай і выканаўчай улады.

Для ўплыву на фарміраванне грамадзянскай пазіцыі, развіцця нацыянальнай самасвядомасці ў студэнтаў у БДУ створана добрая сістэма інфармавання, у працы Мінскага гарадскога таварыства "Веды" ўдзельнічае лектарская група універсітэта ў складзе 35 чалавек.

— Адным з найважнейшых звёнаў ідэйна-выхаваўчай работы з'яўляюцца сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны. Якая іх роля і значэнне ў забеспячэнні ідэалагічнай работы ва універсітэце?

— Адной з прыярытэтных задач работы прафесарска-выкладчыцкага саставу гума-

(Закончэнне на 2-й стар.)

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

У аснове ідэалогіі — рэальныя каштоўнасці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

нітарных факультэтаў з'яўляецца фарміраванне спецыяліста, які спалучае прафесійную кампетэнтнасць, грамадзянскую сталасць, высокую сацыяльную актыўнасць, адказнасць і прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцяў гуманістычнай культуры. Таму ўся дзейнасць выкладчыкаў арыентуецца на напаўненне навучальна-выхаваўчага працэсу глыбокім ідэалагічным і выхаваўчым зместам. У працэсе заняткаў выкладчыкі, вядома ж, прывіваюць студэнтам пачуццё патрыятызму, любові да Беларусі, імкненне зрабіць свой годны ўнёсак у яе развіццё і дабрабыт.

Інтэграцыйным элементам усёй сістэмы ідэалагічнай работы, на маю думку, з'яўляецца ўведзены ў верасні 2003 г. у навучальныя планы ўсіх спецыяльнасцяў заліковы курс "Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы". Валодаючы глыбокімі ведамі ў галіне сацыяльна-гуманітарных навук, разбіраючыся ў пытаннях станаўлення айчыннай грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы, маючы ўяўленне пра глабальныя праблемы чалавецтва і шляхі выхаду з сучаснага цывілізацыйнага крызісу, спецыяліст-гуманітарый павінен умець укараняць у масавую грамадскую свядомасць асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы, уносіць удакладненні ў практыку арганізацыі ідэйна-тэарэтычнага, патрыятычнага і маральнага выхавання.

Спецыяліст-гуманітарый, безумоўна, павінен мець вопыт і навыкі практычнага прымянення атрыманых ведаў у выкладчыцкай, прапагандысцкай дзейнасці, умець выкарыстоўваць атрыманую тэарэтычную інфармацыю на практыцы ў ідэалагічнай рабоце; валодаючы сучаснымі ведамі, быць у стане паспяхова вырашаць задачы ўдасканальвання формаў і метадаў ідэалагічнай работы.

Не выклікае сумненняў, што падрыхтоўка кадраў для ідэалагічнай работы не выключае, а ўзмацняе ролю і значэнне развіцця навуковых даследаванняў і фарміравання новых пакаленняў даследчыкаў у галіне сацыяльна-гуманітарных навук. Гэта карані адзінага дрэва гуманітарных ведаў. Без падрыхтоўкі, без фарміравання гэтых каранёў рана ці позна стане нежыццяздольным усё дрэва.

Перспектыва развіцця факультэтаў, як мне падаецца, павінна быць арганічна ўвязаная з засваеннем тых напрамкаў у навучальна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці, якія па змесце звязаныя з распрацоўкай ідэалогіі сучаснай беларускай дзяржавы. Сярод гэтых кірункаў можна ўказаць наступныя:

1. Захаванне і ўмацаванне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, незалежнасці і суверэнітэту нашай краіны ў сям'і народаў Еўропы і свету.

2. Захаванне ўласнай культурнай ідэнтычнасці за кошт прыярытэтнага развіцця нацыянальных духоўных традыцый і пашырэння сферы прымянення беларускай мовы з мэтай рэальнага забеспячэння яе дзяржаўнага статусу.

3. Усебаковае развіццё і распаўсюджванне нацыянальных культурных дасягненняў і ўзораў народнай творчасці.

4. Сістэмнае засваенне і папулярызацыя нацыянальнай гісторыі і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці грамадзян краіны (найперш моладзі) на прынцыпах любові і павагі да векавых традыцый і звычаяў нашых продкаў, гонару за іх дасягненні і сацыяльныя заваёвы.

5. Актыўнае ўключэнне грамадзян Беларусі ў працэсы кроскультурнай камунікацыі і засваення сусветнай і еўрапейскай культурнай спадчыны.

6. Правядзенне дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на забеспячэнне духоўнага і культурнага развіцця насельніцтва Беларусі.

7. Усебаковае развіццё сучасных інфармацыйных тэхналогій і стварэнне ўмоваў для рэалізацыі творчых здольнасцяў грамадзян Беларусі ў міжнародных адукацыйных праектах, сумесных навуковых даследаваннях і мастацкай творчасці.

8. Стварэнне неабходных умоваў для развіцця экалагічнай культуры беларускага насельніцтва і фарміравання яго экалагічнай свядомасці.

— Якую ролю ў станаўленні нацыянальнай ідэалогіі (у тым ліку і як навуковай дысцыпліны) можа і павінен адыгрываць наш універсітэт? Ці мяркуецца далейшае даследаванне гэтай праблематыкі ў БДУ, выпуск навуковай, навучальна-метадычнай літаратуры?

— БДУ, з'яўляючыся цэнтрам падрыхтоўкі нацыянальных кадраў, адыгрывае значную ролю ў сістэме вышэйшай адукацыі краіны. Гэтая роля з'яўляецца такой жа значнай і ў станаўленні і развіцці нацыянальнай ідэалогіі, у тым ліку і ў кантэксце пастаўленага пытання.

Ва універсітэце існуе сістэма навуковых даследаванняў па праблемах, звязаных з ідэалогіяй беларускай дзяржавы. Пры гэтым яна ахоплівае як студэнтаў, так і прафесарска-выкладчыцкі састаў. Для студэнтаў, у прыватнасці, гэта звязана з удзелам у IV Рэспубліканскім конкурсе творчых работ па грамадскіх навуках "Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа" (да 60-годдзя Перамогі над фашысцкай Германіяй). Мэта конкурсу, які праводзіцца саветам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных студэнтаў, — стымуляванне пошукава-даследчай дзейнасці навучэнцаў і студэнтаў, выяўленне таленавітай моладзі, фарміраванне яе патрыятычных пачуццяў. На конкурс падаюцца творчыя работы па гістарычных, філасофскіх, сацыялагічных, паліталагічных, эканамічных, краязнаўчых і культуралагічных напрамках даследавання тэматыкі Вялікай Айчыннай вайны.

У тэматычны план выданняў на 2005 г. уключаны шматлікія працы, якія адлюстроўваюць асноўныя прынцыпы дзяржаўнай ідэалогіі: калектывізм, патрыятызм, духоўнасць, сям'ю, а таксама захаванне, развіццё і папулярызацыю універсітэцкіх і нацыянальных традыцый.

— Якая праца вядзецца ва універсітэце па ўзнаўленні музея гісторыі БДУ?

— Гэта вельмі актуальнае і важнае для нас пытанне. Сёння вядзецца канкрэтная работа ў гэтым кірунку. Музей гісторыі кожнай вышэйшай навучальнай установы, у тым ліку і БДУ, з'яўляецца не толькі навучальна-навуковым і асветніцкім, але і ідэалагічным падраздзяленнем навучальнай установы. І музей гісторыі БДУ ў большай меры, чым іншыя вузаўскія музеі, з'яўляецца захавальнікам і выразнікам традыцый і культуры Беларусі, выяўленых у гісторыі галоўнай ВНУ краіны. Ведучы працу па зборы, вывучэнні і захаванні музейных матэрыялаў, якія маюць навучальнае, навуковае і культурнае значэнне, музей выхоўвае пачуццё нацыянальнага гонару, любові да сваёй культуры, мовы, традыцый і павагі да універсітэта.

— Якія асноўныя напрамкі міждысцыплінарных сувязяў у забеспячэнні ідэалагічнай работы?

— Адным з прыярытэтных напрамкаў у сістэме вышэйшай адукацыі з'яўляецца неабходнасць дыялогу сацыяльна-гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных ведаў. Такі дыялог павінен у перспектыве прывесці да фарміравання адзінай навукі — навукі пра чалавека.

Дачыненне чалавека да спасціжэння шэрага складаных аб'ектаў: экалогіі, геннай інжынерыі, мікраэлектронікі і інфарматыкі, кібернетыкі і вылічальнай тэхнікі, — у якія ўключаны сам чалавек, шырокае ўкараненне робатаў і камп'ютараў у вытворчасць і ў самыя розныя сферы жыцця чалавека і грамадства абумоўліваюць неабходнасць як гуманітарызацыі прыродазнаўчай і тэхнічнай адукацыі, так і прыродазнаўчай фундаменталізацыі гуманітарнай адукацыі.

Таму карысным з'яўляецца ўвядзенне ў навучальныя планы такога курса, як "Канцэпцыя сучаснага прыродазнаўства", што ў нейкай ступені і накіраваны на пераадоленне разрыву паміж гуманітарнымі і прыродазнаўчымі ведамі ў сістэме універсітэцкай адукацыі. Гэта дасць магчымасць накіраваць усю сістэму ідэалагічнай работы на станаўленне гарманічнай асобы, якая валодала б цэласнай карцінай рэальнасці і ўмела б спасцігаць свет і розумам, і сэрцам.

Увядзенне ў навучальныя планы гуманітарных спецыяльнасцяў курса, прысвечанага асновам сучаснага прыродазнаўства, з'яўляецца неабходнай і прагрэсіўнай тэндэнцыяй у развіцці вышэйшай прафесійнай адукацыі.

— Якая роля выкладчыка ў ідэалагічнай сістэме ВНУ як непасрэднага носьбіта найбольш аператыўнай інфармацыі, як чалавека аўтарытэтнага ў сваёй галіне ведаў?

— Ідэалагічная работа са студэнцкай моладдзю — працэс, які патрабуе перакананасці і падрыхтаванасці самі х выхавальнікаў, усіх педагагічных кадраў, прадстаўнікоў грамадскіх інстытутаў выхавання, іх умення працаваць ва ўзаемадзеянні, выкарыстоўваючы магчымасці сям'і, навучальнай установы, сродкаў масавай інфармацыі, літаратуры, мастацтва, грамадскіх арганізацый, маладзёжных аб'яднанняў.

Таму выкладчыкі павінны будаваць сваю прафесійную дзейнасць на аснове шэрага найважнейшых прынцыпаў: прафесіяналізм і кампетэнтнасць, пераемнасць, цэласнасць і сістэмнасць. Абгрунтаванне новых светапоглядных каштоўнасцяў, кансалідуючай сістэмы ідэй, якія згуртоўваюць розныя пласты насельніцтва, вызначаюць іх каштоўнасныя арыентацыі, маральныя нормы, лад жыцця, сацыяльную актыўнасць, — гэта адна з галоўных задач, якія стаяць перад выкладчыкам. Выкладчыку, які з'яўляецца базавай адзінкай вузаўскай структуры, неабходна звярнуць увагу не толькі на падрыхтоўку новых версій навучальна-метадычных комплексаў па класічных сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах, што ўключаюць навучальныя праграмы, базавыя канспекты лекцый, зборнікі заданняў, тэстаў і г.д., але і выкарыстоўваць магчымасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй па цыкле агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін і дысцыплін спецыялізацый. Многія спецкурсы па актуальных праблемах гуманітарных ведаў, сучасных тэхналогіях могуць з поспехам чытацца на розных гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтах нашага універсітэта.

Задача выкладчыка — тлумачэнне і ўкараненне ў свядомасць студэнцкай моладзі фундаментальных прыярытэтаў ідэалогіі беларускага грамадства: нацыянальных, эканамічных, сацыяльных.

Іван ФЕДАРОВІЧ
Фотаздымак Аляксандра СНАПКА

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Выхаваўчая работа ў студэнцкім гарадку

Студэнцкі гарадок — адно з найбуйнейшых структурных падраздзяленняў БДУ: уключае 10 інтэрнатаў, у якіх жывуць больш за 6000 студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, навучэнцаў і слухачоў і каля 400 супрацоўнікаў. Сваімі думкамі наконт выхаваўчай работы ў студгарадку з чытачамі "Беларускага універсітэта" дзеліцца дырэктар студгарадка, намеснік прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Павел Міхайлавіч БЫЧКОЎСКІ.

Выхаваўчая работа ў студгарадку вядзецца згодна з перспектыўным планам, які распрацаваны паводле Канцэпцыі выхавання навучэнскай моладзі, Асноўнымі напрамкамі сацыяльнай палітыкі і выхаваўчай работы БДУ з улікам даручэння Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь аб узмацненні ідэалагічнага зместу мерапрыемстваў, якія праводзяцца, і прадугледжвае арганізацыю мерапрыемстваў па ідэйна-выхаваўчым, сацыяльна-педагагічным, псіхолага-педагагічным, культурна-адпачынкавым, інфармацыйна-выхаваўчым і спартыўна-аздараўленчым напрамках.

Асноўным прынцыпам арганізацыі сістэмы выхаваўчай работы ў студэнцкім гарадку БДУ з'яўляецца эфектыўнае спалучэнне кіраўніцкага і самакіраўніцкага механізмаў. Можна вылучыць некалькі ўзроўняў кіравання выхаваўчым працэсам. Узровень інтэрната — гэта педагогі-выхавальнікі інтэрнатаў, адміністрацыя інтэрната. Узровень студэнцкага гарадка — гэта метадычны цэнтр, псіхалагічная служба студгарадка і дырэкцыя студэнцкага гарадка.

Вялікая роля ў дзейнасці інтэрнатаў у цяперашні час належыць самому студэнцтву, а дакладней органам студэнцкага самакіравання, якія выступаюць дзейсным інструментам павышэння якасці падрыхтоўкі маладога спецыяліста, школай выхавання самастойнасці і адказнасці, маральных і грамадзянскіх якасцяў асобы. Студэнцкае самакіраванне ў студгарадку БДУ непасрэдна ў інтэрнатах забяспечваюць старасты пакояў, блокаў, паверхаў, аператыўны атрад, студэнцкі савет; а на ўзроўні студгарадка — студэнцкая служба бяспекі, Каардынацыйны савет студэнцкіх саветаў інтэрнатаў, савет па прафілактыцы парушэнняў Правілаў унутранага распарадку і інш.

Дзеля ўкаранення новых формаў і метадаў педагагічнай дзейнасці, забеспячэння сацыяльна-псіхалагічнага працэсу падтрымкі студэнтаў у студэнцкім гарадку БДУ рэалізуюцца 11 базавых праграм.

Праграма **"Фарміраванне сацыяльнай актыўнасці студэнтаў"**. Мэта праграмы — стварэнне комплексу практычнай работы па фарміраванні сацыяльнай актыўнасці ў студэнтаў з улікам прасацыяльнай накіраванасці.

Праграма **"Студэнцкае самакіраванне"** накіравана на удасканальванне сістэмы сту-

(Заканчэнне на 4-й стар.)

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Студэнт павінен быць шчаслівым

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— спісвання і г.д., дык другі разумее, што для яго лягчэй асвоіць прапанаваны матэрыял. Задача педагога — знайсці спосабы пераканаць студэнта зрабіць правільны з пункту гледжання вопыту і ведання жыццёвых прынцыпаў выбар свайго шляху. Уласна кажучы, гэта і адбываецца на практыцы: менавіта педагог сваімі дзеяннямі падшурхоўвае студэнта да таго ці іншага выбару спосабу дзеяння.

— Як бы вы сфармулявалі асноўныя задачы выхаваўчага працэсу?

— Не раз задумваўся над пытаннем, што ж такое выхаванне. Мне патрэбна было тэхнічнае вызначэнне выхавання, якое дазваляла б сістэматызаваць, адукавана выбудоўваць сваю работу. Перакапаў безліч разумных кніг, філасофскіх слоўнікаў. У выніку я спыніўся на вызначэнні выхавання як мэтанакіраванага ўплыву на інтарэсы моладзі. А пад інтарэсамі я разумею тое, як моладзь уяўляе сабе спосабы задавальнення сваіх актуальных патрэбаў.

Так, напрыклад, што нам патрэбна рабіць, каб уплываць на студэнцкую моладзь, — падтрымліваць маладзёжныя ініцыятывы і малыя маладзёжныя аб'яднанні. Што такое, па сутнасці, малое маладзёжнае аб'яднанне? Гэта асяродак, дзе малады чалавек прыняты і прызнаны, дзе ён стварае не толькі нешта карыснае для іншых, але і сябе, і сваё атачэнне. Калі студэнты самі сабраліся дзеля цікавай карыснай справы, ім абавязкова трэба дапамагчы, знайсці правільнае рэчышча для задавальнення патрэбы ў сацыяльнай творчасці. Можа, яны нам урэшце нават і не падзякуюць, але выхаваўчы эфект абавязкова будзе. Калі ж мы не дапаможам нашай моладзі, дапамогуць іншыя структуры, і тады нам застанецца толькі разводзіць рукамі, дзівячыся плёну гэтай "выхаваўчай" работы.

Падтрымка маладзёжных ініцыятываў у нашым універсітэце — гэта ўжо традыцыя. І гэта тая традыцыя, якая закладзена на перспектыву пад новую арганізацыю працэсу навучання і выхавання. Універсітэт пайшоў нават на тое, каб фінансаваць найлепшыя праекты. Для гэтага другі год мы праводзім конкурс маладзёжных праектаў. Гэта і другасная занятасць, і кірмаш вакансій, і фізкультура, і спорт, і турызм, і маладая сям'я. Гэта і разнастайныя шоу. У выніку набіраецца вельмі вялікі спіс студэнцкіх інцыятываў. З свайго боку, мы лічым правільным ствараць максімум пляцовак для таго, каб студэнты маглі рэалізаваць сябе ў сацыяльнай творчасці. Навыкі, якія набывае студэнт падчас гэтай працы, — гэта своеасаблівы поліс на будучыню. Паверце, іх вельмі цэняць працадаўцы.

— Якія метады могуць найлепш паспрыяць дасягненню гэтага? І якую ролю ў выхаваўчым працэсе адыгрывае студэнцкае самакіраванне?

— Мы добра навучыліся прыдумваць і праводзіць мерапрыемствы. Наш план выхаваўчай работы, можа быць, нават перанасычаны імі. Аднак для мяне як педагога важна, які след пакінула мерапрыемства ў свядомасці студэнта, ці з'явіліся ў яго выніку хаця б некалькі новых студэнтаў, гатовых у гэтай дзейнасці браць удзел. Таму я не стамляюся паўтараць: задача выхавальніка — загадзя прадумаць любое мерапрыемства, якіх мэтаў мы хочам і павінны ім дасягнуць, які мы ўкладаем сэнс у тое ці іншае мерапрыемства. І чаму мы можам разлічваць, што гэтыя мэты будуць дасягнуты. Для мяне адна з важных умоваў эфектыўнасці — абавязковае абмеркаванне падзеяў, мерапрыемстваў у студэнцкім асяроддзі.

Архіважная рэч у гэтым плане — лакальныя сродкі масавай інфармацыі. Яны не канкурэнты "Беларускаму універсітэту", у іх розныя задачы. Гэтыя СМІ дапамагаюць моладзі абмеркаваць, сфарміраваць адносіны да той ці іншай падзеі на зразумелай для яе мове. Яны выконваюць і найважнейшую для выхавацеляў ролю зваротнай сувязі, без якой мы не заўсёды адчуваем, якія праблемы хвалююць моладзь.

І тут я пераходжу да тэмы студэнцкага самакіравання. Што яно павінна быць ва універсітэце — я перакананы. А вось як яго развіваць правільна — вельмі складаная выхаваўчая задача. Студэнцкае самакіраванне — гэта і канал інфармацыі, дзякуючы якому мы можам ацэньваць эфектыўнасць сваёй працы, і школа лідэрства, школа фарміравання навыкаў калектыўнай працы, і тэхналогія, якая дазваляе вельмі хутка ператварыць групу людзей у калектыў. Сёння нашая псіхалагічная служба ўжо падрыхтавала некалькі практычных дапаможнікаў — напрыклад, як вызначаць і выбіраць лідэра. Але гэта толькі першыя крокі. Цяпер мы рыхтуем праграмы па ўцягненні студэнтаў у арганізацыю навучальна-выхаваўчага працэсу і шэраг іншых.

— У чым спецыфіка выхаваўчай работы ва універсітэцкім калектыве?

— Я ў іншых калектывах працаваў не так шмат, каб мець права меркаваць. Асабіста мне тут, ва універсітэце, працаваць у кайф. Шмат у чым дзякуючы таму, што калектыў выкладчыкаў і выхавальнікаў, які ажыццяўляе навучальна-выхаваўчы працэс, складаецца з людзей з сталымі перакананнямі, якія маюць за плячыма навуковыя працы, ступені і веды. Кожны з іх — асоба. З аднаго боку, гэта спрашчае арганізацыю выхаваўчай работы. З іншага, не тое каб ускладняе, але патрабуе ад кіраўніка дадатковых намаганняў. Адно ведаю дакладна — ва універсітэце камандна-адміністрацыйныя метады не праходзяць. Эфектыўная работа тут магчымая толькі як сумесная творчасць раўнапраўных калег. Студэнты ў БДУ адкрытыя, не запалоханыя, з гонарам. Але яны маюць патрэбу ў падтрымцы.

Наша задача — ненавязліва дапамагчы ім разабрацца ў сучасным складаным свеце, накіраваць іх энергію на добрую справу.

Напрамкі выхаваўчай працы адлюстраваныя ў плане выхаваўчай работы ва універсітэце: сацыяльная адаптацыя студэнтаў, маральна-псіхалагічнае станаўленне, актывізацыя адукацыйнай дзейнасці, актывізацыя грамадзянскага, патрыятычнага, маральна-эстэтычнага кампанентаў асобы і г.д. У плане не выпадкова запісана не "грамадзянскае, патрыятычнае, маральнае выхаванне", а "актывізацыя грамадзянскага, патрыятычнага, маральна-эстэтычнага кампанентаў асобы". Мы зыходзім з таго, што кожны чалавек мае гэтыя ўласцівасці, і мы павінны толькі дапамагчы ім актывізаваць гэтыя моманты. Імкненне актывізаваць грамадзянскую, патрыятычную пазіцыю — гэта паважлівае стаўленне да студэнта. Выхавальніку вельмі важна працаваць далікатна, разумеючы механізмы, якія ляжаць у стварэнні перакананняў. Калі ж навязваць, удзёўбваць нейкія рэчы — гэта, як правіла, выклікае ў студэнтаў адмоўную, абарончую рэакцыю.

— Якая роля педагога ў выхаваўчым працэсе: ён павінен быць толькі транслятарам ведаў ці адначасова і маральным аўтарытэтам для студэнтаў?

— Я ўжо закранаў гэтую тэму. Сапраўды, педагог заўжды на пярэднім краі. На яго глядзяць як на прадстаўніка універсітэта, як на прадстаўніка Міністэрства адукацыі і, урэшце, як на прадстаўніка дзяржавы. Важна, каб ён сам усведамляў усю меру ўскладзенай на яго адказнасці. Менавіта ён часцяком першым задае студэнтам арыенціры ў ацэнцы падзеяў. Магчыма, ён не заўсёды сам усведамляе гэта, але тым не менш гэта адбываецца так.

З самага першага дня ва універсітэце паміж студэнтамі і выкладчыкамі пачынаецца дыялог, і адказнасць за вынік гэтага ўзаемадзеяння я схільны ўскладаць найперш на выкладчыка. Я пераканаты, што практычна ўсе студэнты, якія паступілі да нас, хочуць вучыцца, атрымаць спецыяльнасць, авалодаць навыкамі дарослага жыцця. Важна гэтую гатоўнасць працаваць, жаданне авалодаць новымі ведамі і навыкамі захаваць і ўмацаваць як найважнейшы рэсурс прафесійнага і сацыяльнага станаўлення студэнта. Але бывае, што прыходзяць на першы курс выкладчыкі і, не патлумачыўшы толкам сэнс сваіх дысцыплін, пачынаюць патрабаваць, патрабаваць, патрабаваць... Сутыкнуўшыся з ціскам і неразуменнем з боку выкладчыкаў, некаторыя студэнты проста перастаюць працаваць, пачынаюць шукаць іншыя сферы для задавальнення сваіх сацыяльных патрэбаў. І, вядома ж, знаходзяць камфортнае для сябе, але не заўжды сацыяльна здаровае асяроддзе. У выніку педагагічна некарэктныя паводзіны выкладчыка пры фармальным захаванні высокага ўзроўню патрабаванняў да студэнтаў фактычна выштурхоўваюць частку студэнтаў з універсітэцкага адукацыйнага асяродку. Так актыўная пазнавальная пазіцыя трансфармуецца ў тактыку пазбягання няўдач.

Адсюль я выводжу простую задачу: мы павінны так арганізоўваць і навучальны, і выхаваўчы працэс ва універсітэце, каб у нашых студэнтаў не ўзнікала жаданне задавальняць свае сацыяльныя патрэбы па-за адукацыйнай сферай, разумна падтрымліваць у іх цікавасць і да навучання, і да універсітэта, як нашага агульнага дому.

Калі выкладчыкі прафесійна вядуць педагагічную работу, дык студэнты добра засвойваюць не толькі веды, але і жыццёвыя, у тым ліку і маральныя прынцыпы сваіх педагогаў і потым ужо рэдка калі іх парушаюць. Таму роля выкладчыка ў выхаванні неацэнная. Апасродкаванай ацэнкай якасці нашай працы з'яўляецца прэстыж універсітэта ў грамадстве, павага да нашых выпускнікоў, павага студэнтаў і выпускнікоў да сваіх настаўнікаў.

На заканчэнне, перафразуючы словы аднаго вядомага педагога, хачу сказаць: студэнт павінен быць шчаслівым. І выкладчык павінен быць шчаслівым. Вось на гэтых двух простых перакананнях мы імкнемся будаваць навучальна-выхаваўчы працэс ва універсітэце, сумесную дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў.

Таццяна КУХАРЧУК
Фотаздымак Аляксандра СНАПКА

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Клопат пра моладзь

1 снежня споўніцца 10 гадоў з часу стварэння ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю (раней аддзела па справах моладзі). Пра дзейнасць упраўлення распавядае яго начальнік кандыдат хімічных навук Міхаіл Барысавіч ЧАРАПЕННІКАЎ.

Асноўная мэта дзейнасці ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю — гэта рэалізацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў галіне адукацыі, выхавання і сацыяльнай абароны студэнцкай моладзі, развіццё студэнцкага самакіравання універсітэта, захаванне найлепшых традыцый маладзёжнага руху, ідэалагічнае забеспячэнне праграм і мерапрыемстваў, якія праводзяцца ва універсітэце, інфармацыйнае і метадычнае забеспячэнне працы куратараў акадэмічных груп. У структуру ўпраўлення ўваходзяць два аддзелы — інфармацыйна-ідэалагічны і аддзел маладзёжных і сацыяльных праграм.

Адным з асноўных напрамкаў дзейнасці з'яўляецца развіццё органаў студэнцкага самакіравання. Дзеля гэтага ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю садзейнічае ў стварэнні нарматыўна-прававой базы, якая рэгламентавала б працу органаў самакіравання. Распрацаваны і зацверджаны пакет дакументаў, які рэгламентуе дзейнасць Савета па матэрыяльным стымуляванні і аказанні матэрыяльнай дапамогі, Палажэнне аб студэнцкім Савеце па якасці адукацыі, Палажэнне аб Савеце старастаў БДУ. Штогод дапрацоўваецца і выдаецца Памятка старасту акадэмічнай групы. З мэтай удасканальвання дзейнасці органаў студэнцкага актыву і ўсталявання ў студэнцкім асяроддзі аптымальнага маральна-псіхалагічнага клімату рэгулярна праводзяцца навучальныя семінары "Школа маладзёжнага актыву" на базе РІВШ БДУ, сталі традыцыйнымі выязныя семінары на базе САК "Брыганціна" БДУ.

Адзін з напрамкаў працы, які актыўна развіваецца і ў рэалізацыі якога непасрэдна бяруць удзел студэнты БДУ, — развіццё сувязяў з рэспубліканскімі і замежнымі структурамі па рабоце з моладдзю. Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю спрыяе развіццю міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва праз абмены дэлегацыямі з маладзёжнымі грамадскімі арганізацыямі і аб'яднаннямі ВНУ краін СНД і далёкага замежжа. Былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве з маладзёжнымі арганізацыямі МДУ імя М. Ламаносава (Расія), Студэнцкім самакіраваннем Ягелонскага універсітэта (Польшча), Вільнюскім універсітэтам (Літва). У 2003 г. былі арганізаваны візіты прадстаўнікоў студэнцкага актыву ў Вільнюскі універсітэт, у Нацыянальны тэхнічны універсітэт Украіны "Кіеўскі політэхнічны інстытут", у Ягелонскі універсітэт. Мы забяспечылі прыём дзвюх студэнцкіх арганізацый з Вільнюскага універсітэта і адной дэлегацыі студэнтаў з універсітэтаў Еўрапейскага саюза, якія навучаюцца ва універсітэце права Літвы, прыём дэлегацыі Нацыянальнага тэхнічнага універсітэта Украіны "Кіеўскі політэхнічны інстытут", прыём прадстаўнікоў Студэнцкага саюза Ягелонскага універсітэта. У красавіку 2004 г. супрацоўнікі ўпраўлення прынялі ўдзел у працы міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай праблеме развіцця студэнцкіх органаў самакіравання, арганізаванай Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам.

Для ўзмацнення ідэалагічнага складніка ў сістэме выхаваўчых мерапрыемстваў, якія ладзяцца ў БДУ, у 2004 г. праводзяцца экскурсіі па мясцінах працоўнай і баявой славы беларускага народа.

Вялікая ўвага надаецца спрыянню ў развіцці і ўмацаванні студэнцкіх традыцый, распрацоўцы механізмаў правядзення працоўных акцый студэнтаў, удзелу ў арганізацыі і правядзенні агульнаўніверсітэцкіх культурна-масавых мерапрыемстваў. Важную ролю ў правядзенні працоўных акцый адыгрывае Студэнцкі цэнтр занятасці. У 2004 г. студэнты БДУ паводле накіравання Студэнцкага цэнтра занятасці прымалі ўдзел у працы будаўнічых атрадаў па Мінску, валанцёрскіх атрадаў на спартыўна-аздараўленчай базе "Браслаўскія азёры", навучальна-навуковай станцыі "Волма". З 2001 г. аддзел рэалізацыі маладзёжных і сацыяльных праграм арганізуе штогадовую акцыю ў падтрымку дзіцячых дамоў "Мы разам". 1—3 чэрвеня 2004 г. разам з Фундаментальнай бібліятэкай БДУ была наладжана акцыя "Радасць дзецям", прысвечаная Міжнароднаму дню абароны дзяцей. Гэтае мерапрыемства адбылося ў 15 дзіцячых дамах Маскоўскага раёна Мінска і ў дзіцячым доме № 3. Супрацоўнікі ўпраўлення разам з упраўленнем па справах культуры ўдзельнічаюць у арганізацыі і правядзенні агульнаўніверсітэцкіх культурна-забаўляльных мерапрыемстваў — такіх, як Дзень ведаў, Дзень заснавання БДУ, Дзень студэнта, Баль выпускнікоў і г.д.

Важны напрамак работы — каардынацыя дзейнасці па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, дактарантаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Упраўленне ажыццяўляе прафілактычную работу па праблемах правапарушэнняў сярод студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, супрацоўнікаў універсітэта і своечасова рэагуе на факты правапарушэнняў.

Вялікая ўвага надаецца павышэнню кваліфікацыі супрацоўнікаў універсітэта, звязаных з выхаваўчым працэсам, арганізацыі семінараў, канферэнцый па праблемах студэнцкага самакіравання. З мэтай актывізацыі і ўдасканалення работы, абмену вопытам, выяўлення і ўкаранення ў практыку інавацыйных падыходаў у рабоце са студэнцтвам арганізаваны конкурс "Куратар года БДУ".

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» і клуб сяброў газеты шчыра віншуюць упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю з 10-гадовым юбілеем!

Жадаем моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі, поспехаў і ўдачы ва ўсім. Спадзяемся на далейшае творчае супрацоўніцтва.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

30 лістапада 2004 года, №№ 20-21 (1905-1906)

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Выхаваўчая работа ў студэнцкім гарадку

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

дэнцкага самакіравання студгарадка БДУ, развіццё сацыяльнай актыўнасці студэнтаў, фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі, умацаванне маральных асноваў студэнцкага калектыву.

Стварэнне комплекснага ўяўлення пра псіхолага-педагагічныя характарыстыкі студэнта, асноўныя метады і тэхнікі індывідуальнай і групавой педагагічнай і псіхалагічнай работы з студэнтамі — асноўныя задачы праграмы **"Псіхолага-педагагічны партрэт студэнта"**.

У рамках праграмы **"Грамадская інфармацыйная служба"** вядзецца работа па ўдасканаленні інфармацыйна-выхаваўчай работы, развіцці ў студэнтаў пачуцця патрыятызму, фарміраванні актыўнай грамадзянскай пазіцыі, пачуцця гонару і павагі да БДУ, наладжванні зваротнай сувязі са студэнцтвам. Таксама выдаецца газета "Студенческий городок", развіваецца сетка малатыражных газет інтэрнатаў, функцыянуюць лакальныя сеткі інтэрнатаў і Інтэрнэт-сайт студгарадка.

Праграма **"Адаптацыя студэнтаў першага курса да новых сацыяльных умоваў"**. Мэта праграмы — аптымізацыя працэсу адаптацыі студэнтаў першага курса да новых умоваў навучання і сумеснага пражывання ў інтэрнаце.

На стварэнне комплекснай дыягнастычнай праграмы вывучэння ўласцівасцяў асобы, сацыяльнага асяроддзя накіравана праграма **"Практычная псіхадыягностыка"**.

Праграма **"Сацыяльна-псіхалагічны трэнінг для студэнтаў"**. Мэта — стварэнне трэнінгавага цэнтра развіццёвага навучання, стварэнне сістэмы трэнінгавых і рэлаксацыйных заняткаў.

Студэнты, якія жывуць у інтэрнаце, маюць шырокія магчымасці для актыўнага ладу жыцця, удзелу ў грамадскім і культурна-масавым жыцці як студэнцкага гарадка, так і універсітэта ў цэлым. Адбываецца Фестываль студэнцкай творчасці, у рамках якога праводзяцца мерапрыемствы, якія сталі ўжо традыцыйнымі і заслужылі вялікую любоў студэнтаў: "Міс Вясна", "Срэбраныя струны", "Супермен", "Кубак гумару". Цікава і з карысцю для сябе бавяць студэнты вольны час у клубах і гуртках студгарадка: гурток сучаснага пашыву і дызайну вопраткі "Умелыя рукі", студыя сучаснага эстраднага танца "Non Stop", мастацкая майстэрня-студыя, гістарычны клуб "Калюмны", клуб "Мой родны кут", клуб студэнцкай песні, літаратурна-музычная гасцёўня "Натхненне". Гэтая праца вядзецца ў рамках праграмы **"Культурна-адпачынкавая дзейнасць студэнцкай моладзі"**, мэта якой — захаванне і развіццё традыцый студэнцкага і універсітэцкага жыцця; фарміраванне духоўна-маральных каштоўнасцяў і культуры студэнцкай моладзі; стварэнне ўмоваў для развіцця творчых здольнасцяў і талентаў студэнтаў, распрацоўка сістэмнага падыходу ў кіраванні культурна-адпачынкавай дзейнасцю ў студэнцкім асяроддзі.

"Мы — за здаровы лад жыцця!" — крэда сучасных студэнтаў, таму вялізная ўвага ў студгарадку надаецца спартыўна-аздараўленчым і прафілактычным мерапрыемствам, працы па прапагандзе здаровага ладу жыцця. З гэтай мэтай адбываецца штогадовая спартакіяда па 9 відах спорту, "Спартландыя", разнастайныя турніры і матчавыя сустрэчы, працуюць спартыўныя секцыі (аздараўленчай аэробікі, баскетбола, брэйк-дансу, каратэ), адбываюцца сустрэчы са спецыялістамі аховы здароўя, валеолагамі, вядомымі спартсменамі. У інтэрнатах абсталяваны спартыўныя пакоі і залы, дзе размяшчаюцца трэнажоры для атлетычнай гімнастыкі, тэнісныя і більярдныя сталы, іншы спартыўны інвентар. Забяспечыць рэалізацыю гэтага напрамку выхаваўчай работы павінна праграма **"Фарміраванне здаровага ладу жыцця ў студэнтаў"**.

Праграма **"Працоўнае лета"**. Мэта праграмы — спрыянне ў ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі ў галіне занятасці моладзі: стварэнне эфектыўнай сістэмы другаснай занятасці студэнтаў БДУ ў летні перыяд, што забяспечвала б сацыяльнае і прафесійнае станаўленне асобы студэнта, спрыяла сацыялізацыі, выхаванню, развіццю студэнцкай моладзі універсітэта. Работа па арганізацыі другаснай занятасці студэнтаў вядзецца па наступных кірунках: летнія сельскагаспадарчыя атрады ў Крыме, летнія педагагічныя атрады (Крым, Беларусь), працоўныя атрады па ўпарадкаванні і падрыхтоўцы да новага навучальнага года інтэрнатаў. Толькі ў 2004 г. былі працаўладкаваныя больш за 550 студэнтаў.

Цікавасць выклікае і турыстычны напрамак дзейнасці студгарадка, мэта якога — арганізацыя пазнаваўчага адпачынку студэнтаў, духоўна-маральнае выхаванне, азнаямленне студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах БДУ, з гісторыяй і культурай Беларусі і краінаў бліжняга замежжа, развіццё і замацаванне сяброўскіх сувязяў з замежнымі маладзёжнымі арганізацыямі. За чатыры гады існавання праграмы **"Турызм і адпачынак"** студэнты мелі магчымасць наведаць беларускія памятныя мясціны і пабываць за мяжой.

Ва ўсіх інтэрнатах арганізаваны і паспяхова функцыянуюць пакоі сацыяльнага, спартыўнага і культурна-асветнага прызначэння: чытальныя залы, у якіх студэнты могуць азнаёміцца з падшыўкамі рэспубліканскіх і гарадскіх газет, пакоі для самападрыхтоўкі і адпачынку, відэасалоны, пакоі для студэнцкага самакіравання.

Такім чынам, у студгарадку сфарміравалася шматузроўневая сістэма выхаваўчай работы, створаны ўмовы для творчага і інтэлектуальнага росту студэнтаў, іх сацыялізацыі і адаптацыі, фарміравання асобы студэнта на аснове нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцяў.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Патрыятызм і адданасць сваёй краіне цаніліся ва ўсе часы

Гісторыя на прыкладах пераконвае, што няма і не існавала працяглы час дзяржавы без ідэалогіі, без пэўнай аб'яднаўчай ідэалогіі. Успомнім тое ж узрастанне тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, якое адбывалася пад праваслаўным сцягам. Князі Вялікага княства Літоўскага, можа, і заставаліся язычнікамі, але многа рабілі для справы праваслаўя ў інтарэсах будучыні дзяржавы. І якраз слабасць Рэчы Паспалітай была ў тым, што не было выпрацавана такой аб'яднаўчай ідэі — гэта адна з прычын яе распаду. Вяртанне ўвагі да ідэалагічнай работы — гэта заканамерная з'ява. Гісторыя выпрацоўвае арыенціры, на якія мы імкнемся раўняцца, прыклады, на якіх мы выхоўваем падрастаючае пакаленне.

Госць газеты "Беларускі універсітэт" — дэкан гістарычнага факультэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Сяргей Мікалаевіч ХОДЗІН.

— Як арганізуецца ідэалагічна-выхаваўчая работа на вашым факультэце?

— Канешне, гэта тая работа, якая павінна адбывацца пад кантролем. Працэс навучання (ці мае ён вялікі акцэнт на самастойную работу ці не мае) усё ж адбываецца пад пэўным кантролем. У нас ёсць разуменне неад'емнасці адукацыі і выхавання. Калі размова ідзе пра гістарычную адукацыю, сказаць, дзе завяршаецца адукацыя, а дзе пачынаецца выхаванне, — вельмі складана. Мы крышку інакш пабудавалі структуру намеснікаў дэканаў, змянілі іх функцыі. Традыцыйны падыход — калі адзін з намеснікаў адказваў за адукацыю, а другі — за выхаванне. На факультэце прызначаны намеснік дэкана па першай ступені вышэйшай адукацыі і намеснік па другой ступені. Яны адказваюць і за вучэбныя планы, і за праграмы курсаў, і за арганізацыю выхаваўчай работы.

Намеснік па першай ступені арганізуе работу куратараў. Другая ступень — час, калі гісторыкі спецыялізуюцца ў залежнасці ад выбранага кірунку. І тут ужо ўзрастае роля кафедры, тут трэба каардынаваць ролю кафедраў у дачыненні да гэтай работы — і выхаваўчай, і адукацыйнай. Намеснік дэкана павінен выдатна ведаць, які матэрыял выкладаецца, якія праграмы курсаў, якія спецкурсы. Гэта не значыць, што мы такім чынам імкнемся супыніць нейкі плюралізм думак. Мы імкнемся (асабліва на другой ступені) вызначыць індывідуальнасць даследчыка, стварыць умовы для таго, каб ён мог самастойна выпрацоўваць сваю пазіцыю, абгрунтоўваць свае вывады. Пры такім падыходзе ёсць спадзяванне, што нашы выпускнікі будуць не нейкімі элементамі, вінцікамі і г.д., а патрэбнымі ўдумлівымі спецыялістамі. Цяпер актыўна ідуць працэсы глабалізацыі, вельмі імкліва змяняецца сітуацыя. І для таго, каб адказваць на пытанні сённяшняга дня, трэба не толькі выдатна ведаць мінулае, але і ўмець вельмі хутка, дынамічна рэагаваць на змены. Як паказвае жыццё, менавіта ў такі перыяд дынамічных змен няўменне самастойна выпрацоўваць свой пункт гледжання прыводзіць да таго, што маладыя спецыялісты, людзі з вышэйшай адукацыяй ідуць за кімсьці, не заўсёды асэнсоўваючы змест, сутнасць, кірункі розных лозунгаў.

— Як вы ацэньваеце дзейнасць кафедраў гістарычнага факультэта ў ідэйна-выхаваўчай рабоце?

— Кафедры гісторыі Беларусі ажыццяўляюць выкладанне курса гісторыі Беларусі амаль на ўсіх факультэтах БДУ. І тут я хацеў бы пазначыць, што па-першае, вельмі пільная ўвага надавалася праграме гэтага курса. Яна ўжо на сённяшні момант перапрацавана. Па-другое, што тычыцца зместу, мы, канешне, як раней не патрабуем ад выкладчыкаў таго, каб яны пакінулі курсы лекцый на подпіс дэкану, перш чым пойдуць выкладаць. Выкладчык, які прыходзіць у аўдыторыю, без такога кантролю павінен кіравацца задачамі, вызначанымі дзяржавай.

У ідэйна-выхаваўчай рабоце (я маю на ўвазе ідэалагічную функцыю гісторыі) значна ўзрастае роля выкладчыка. Нашы студэнты, я гэта магу сказаць ужо адказна, ацэньваючы выкладчыка, імкнуцца акрэсліць яго індывідуальнасць, у тым ліку і як лектара, і як прафесіянала ў сваёй сферы, сваім гістарычным полі. Так што тут, канечне, роля выкладчыка вызначальная. І калі ў студэнта ёсць нейкае канкрэтнае пытанне, паралель паміж гістарычнымі падзеямі і сучаснасцю, ці погляд у будучыню, то задача выкладчыка — не толькі выступіць спецыялістам па канкрэтнай праблеме, але і адначасова прасачыць, наколькі гэтая праблема з'яўляецца прымальнай і з гістарычнага пункту гледжання, і з пункту гледжання выхавання. Таму што ён ужо выступае ў такім выпадку і як выкладчык, і як грамадзянін сваёй дзяржавы, і як той, хто адначасова ажыццяўляе гэты выхаваўчы працэс.

— Якая на гістфаку праводзіцца работа па захаванні, развіцці нацыянальных традыцый?

— Мне здаецца, што на сённяшні момант мы павінны надаваць значна большую ўвагу краязнаўству. У школьных падручніках пад рэдакцыяй Л.С. Абецадарскага дый у праграмах заўсёды быў урок гісторыі роднага краю. І калі настаўнік яго ўмее эфектыўна арганізаваць, гэта аказвае вялізарнае выхаваўчае ўздзеянне. Дарэчы, у нас сярод спецыяльных гістарычных дысцыплін ёсць курс краязнаўства. І мы павінны ўмець арганізоўваць гэтую працу. Таму што патрыятызм пачынаецца з гісторыі сваёй сям'і, з гонару за сваіх бацькоў, родных, блізкіх, за свае карані. Успомнім шляхецкае асяроддзе. Шляхта — гэта войска, і вялікая ўвага надавалася патрыятычнай рабоце. З чаго яна пачыналася? Шляхціч павінен быў да сёмага калена ведаць увесь свой род — інакш ты не шляхціч! Самае галоўнае, чаму ён ганарыўся сваім родам, — таму што павінен быў не падвесці свой род, выступіць прыкладам для наступных пакаленняў.

Чалавек можа на нейкі час страціць працаздольнасць — гэта яшчэ не страшна. Страшна — калі ён губляе памяць. Задача гісторыкаў — акумуляваць гістарычную памяць для вырашэння надзённых праблем. Гісторыкі працуюць у самых розных сферах, і ўсюды яны павінны быць арганізатарамі ідэалагічнай работы. Гістарычная псіхалогія, гістарычная свядомасць пэўнай эпохі яскрава сведчаць, што такія паняцці, як патрыятызм, як адданасць сваёй краіне, цаніліся ва ўсе часы. На гэта мы імкнемся акцэнтаваць увагу і паказаць гэта праз нацыянальныя традыцыі. Асабліва гэта важна пры ўзмацненні працэсаў глабалізацыі. На адной з канферэнцый у Балгарыі расійскі навуковец сказаў, што гэта непазбежны працэс, што трэба змірыцца. Я яму адказаў, што старэнне чалавечага арганізма — таксама заканамерны працэс, але чамусьці я не бачу ні аднаго чалавека, які хоча змірыцца з тым. Якраз наадварот — энергічныя людзі імкнуцца з гэтым змагацца па самых розных кірунках: і маладосцю сваёй душы, і цела. Так што, можа быць, працэсы глабалізацыі таксама непазбежныя, але калі мы пры гэтым не памкнемся захаваць свае нацыянальныя традыцыі, сваю адметнасць, і калі мы не падрыхтуем для гэтага спецыялістаў, здольных гэта зрабіць, то ў такім выпадку, я думаю, што мы можам проста сапраўды растварыцца. Асабліва пры той мадэлі аднапалярнасці, якая так акцэнтуецца.

Іван ФЕДАРОВІЧ

Фотаздымак Аляксандра СНАПКА

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Пра перспектывы развіцця фізічнай культуры і спорту ва універсітэце, пра фарміраванне і ўмацаванне здаровага ладу жыцця студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ наш карэспандэнт размаўляла з загадчыкам кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ Сяргеем Уладзіміравічам МАКАРЭВІЧАМ і загадчыцай кафедры грамадскага здароўя і аховы здароўя БДУ Галінай Міхайлаўнай БАЦЯН.

Добрым спецыялістам патрэбна добрая фізічная форма

— Сяргей Уладзіміравіч, нашыя студэнты і супрацоўнікі пераважна працуюць у аўдыторыях, бібліятэках, шмат часу аддаюць кнігам і камп'ютарам. Пры такім характары асноўнай дзейнасці фізічная нагрузка ім проста неабходная. А колькі часу павінны аддаваць фізкультуры, напрыклад, наш студэнт?

— Адна гадзіна актыўнага руху ў дзень — і чалавек мяняецца на вачах, яго адносіны да свайго здароўя таксама. Двух тыдняў штодзённых заняткаў дастаткова, каб ён адчуў, што спорт для яго проста неабходны. Менавіта за гэты час у новыя, больш рухомыя ўмовы жыцця ўцягваюцца ўсе ўнутраныя сістэмы чалавека: апорна-рухальны апарат, сардэчна-сасудзістая сістэма, лёгачная і іншыя. Яны ўжо паспяваюць адчуць патрэбу ў фізічных практыкаваннях. І арганізм пачынае сам патрабаваць іх ад чалавека. Трэба сказаць, што студэнцкая моладзь разумее неабходнасць удасканалення свайго здароўя. Паводле вынікаў сацыялагічных апытанняў, здароўе займае на шкале каштоўнасцей адно з першых месцаў.

— Чым могуць зацікавіць студэнта заняткі фізічнай культурай?

— У БДУ ўжо даўно заняткі па фізкультуры праводзяцца па інтарэсах. Ужо на першых занятках студэнты вызначаюцца, якімі відамі спорту яны хацелі б займацца. Сёння студэнцкая моладзь цягнецца да спартыўных гульняў — валейбола, баскетбола, футбола. Ёсць яшчэ лёгкая атлетыка і плаванне. На ўсіх факультэтах уведзена рытмічная гімнастыка, а таксама аэробіка па жаданні. Ёсць што прапанаваць і тым, каго вабяць сілавыя адзінаборствы.

— Аднак далёка не ўсе студэнты з задавальненнем наведваюць заняткі фізкультурай. Чаму?

— Справа ў тым, што ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, і ў наш універсітэт у прыватнасці, паступаюць, як правіла, маладыя людзі, якія вельмі добра вучыліся ў школьныя гады і таму большую частку свайго часу праводзілі за падручнікамі. Для многіх з іх малярухомы лад жыцця стаў звычкай. Да таго ж, 50 % медалістаў сярэдніх школ, якія паступілі ў БДУ, па стане здароўя наогул былі вызвалены ад заняткаў фізічнай культурай. Але і гэтыя студэнты ва універсітэце абавязкова наведваюць спецыяльныя медыцынскія групы. Каб змяніць іх адносіны да фізкультуры, нашы выкладчыкі распрацавалі спецыяльную педагагічную тэхналогію. Для эксперыменту былі ўзяты дзве медыцынскія групы. Адна з іх займалася па звычайнай праграме. А з другой шмат працавалі на працягу ажно трох гадоў: чыталі тэматычныя лекцыі, давалі хатнія заданні, пры гэтым улічваючы захворванні кожнага студэнта. І па даных нашай паліклінікі, 23 % студэнтаў з гэтай групы палепшылі сваё здароўе. Толькі дзякуючы таму, што змянілі свае адносіны да фізкультуры! Медыкаментозным шляхам такога эфекту не дабіцца. Тут сваю ролю адыграла новая сучасная модульная тэхналогія фізічнага выхавання, якую распрацавалі нашы выкладчыкі. На гэты раз студэнтаў выхоўвалі праз фізічныя практыкаванні.

Арандаваныя памяшканні, якія раскіданы па ўсім Мінску, адсутнасць раздзявальняў, душавых, недахоп плошчаў — усё гэта з'яўляецца тормазам у развіцці фізічнай культуры і ў прыватнасці фізічнага выхавання. Але сітуацыя павінна кардынальна змяніцца, калі будзе закончана рэканструкцыя спартыўнага комплекса па вуліцы Кастрычніцкай.

— Універсітэт заўсёды быў прывабным для вядомых спартсменаў. Якімі імёнамі вы ганарыцеся на сённяшні дзень? З каго можна браць прыклад студэнтам?

— Магу назваць адразу некалькі імёнаў. Гэта Андрэй Міхневіч (юрыдычны факультэт) і Надзея Астапчук (гістарычны факультэт), якія ўдала паказалі сябе на Алімпіядзе ў кіданні дыска. Аляксандр Кікінёў (геаграфічны факультэт) з'яўляецца найлепшым байцом у грэка-рымскай барацьбе. Павел Лагун (юрыдычны факультэт) паказвае добрыя вынікі ў плаванні. У нас ёсць каманда па валейболе з шасці чалавек — гэта дзяўчаты з розных факультэтаў, якія двойчы былі бронзавымі прызёрамі на чэмпіянатах Еўропы: Марына Тумас, Алена Гуркова, Алена Глацёнак, Вікторыя Гурава, Кацярына Скірмант, Вольга Карлава.

Трэба сказаць, што нашы каманды і па дзюдо і па грэка-рымскай барацьбе, і па самба — вядучыя ў Беларусі. Сёлета універсітэцкая каманда па грэка-рымскай барацьбе заняла першае месца сярод каманд ВНУ нашай краіны. Наогул у БДУ існуюць чатыры віды барацьбы: грэка-рымская, вольная, дзюдо і самба. А таксама ёсць усходнія адзінаборствы: каратэ, таэквандо, ушу. Усе яны адносяцца да груп спартыўнага ўдасканалення. У БДУ групы спартыўнага ўдасканалення створаны па 22 відах спорту. Да іх адносіцца яшчэ лыжны спорт, лёгкая атлетыка, шахматы, шашкі і г.д. Тут заняткі праходзяць 4—5 разоў на тыдзень. А ёсць групы спартыўнага ўдасканалення, дзе займаюцца члены зборнай каманды, якія праводзяць трэніроўкі два разы на дзень. Зразумела, гэта студэнты, якія займаюцца спортам з дзяцінства і ленавацца не ў іх характары. Актыўны лад жыцця яны ўзялі сабе за правіла.

Увогуле, я лічу, што фізічнае выхаванне, фізічная культура — гэта неабходная частка агульнай культуры асобы. Для таго каб праявіць свае інтэлектуальныя здольнасці, рэалізаваць сябе, таксама патрэбна добрая фізічная форма.

Дый спартсмены не такія ўжо невукі. На нашай кафедры, напрыклад, працуюць 2 дактары навук, 3 прафесары, 10 дацэнтаў, 12 заслужаных трэнераў рэспублікі. Нядаўна мы адкрылі аспірантуру, удзельнічаем у рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях. На нашай кафедры створана навукова-даследчая лабараторыя інфармацыйнага кіравання тэхналогій фізічнага выхавання і спорту. Яна дазваляе весці бесперапыннае экспрэс-назіранне за станам здароўя і працаздольнасцю студэнтаў. Тут устаноўлены сучасныя прыборы, якія дазваляюць атрымліваць інфармацыю пра фізічны стан студэнтаў за 5—6 хвілін. У перспектыве ўсе яны будуць аб'яднаны ў адну сістэму. Выкарыстоўваць іх мы толькі пачалі. Спадзяемся, што ўжо ў канцы гэтага года зможам комплексна абследаваць студэнтаў першага курса аднаго з факультэтаў.

Ганна ЛАГУН

І веды набыць, і здароўе паправіць

— Былая кафедра медыцынскай падрыхтоўкі сёння называецца кафедрай грамадскага здароўя і аховы здароўя БДУ. Яна не толькі змяніла сваю назву, але і ўзяла на сябе новыя функцыі. Чым займаецца кафедра сёння?

— Наша кафедра выконвае не толькі педагагічныя функцыі па падрыхтоўцы студэнтаў да экстрэмальных сітуацый, як гэта рабіла кафедра медпадрыхтоўкі, але і ўдзельнічае ў розных праграмах па фарміраванні грамадскага здароўя. Мы падрыхтавалі цэлы шэраг лекцый па розных праблемах медыцыны для нашых супрацоўнікаў і студэнтаў. Усё пачынаецца з прафілактыкі, з ведаў, што патрэбна рабіць, каб засцерагчы сябе ад захворванняў.

Цыкл лекцый аб здароўі — гэта наш падарунак студэнтам. Нашыя амерыканскія калегі расказвалі, што ў ЗША чалавек плаціць вялікія грошы за такія веды.

— Галіна Міхайлаўна, у БДУ распрацоўваецца праграма "Здароўе" на 2004—2011 гады. Вы ўваходзіце ў рабочую групу па яе стварэнні. Якія найбольш важныя пытанні ў ёй узнімаюцца?

— Стварэнне ўласнай паліклінікі (на 33-ю паліклініку, куды звяртаюцца сёння студэнты нашага універсітэта, шмат нараканняў), стварэнне на базе БДУ рэабілітацыйнага цэнтра для выкладчыкаў і студэнтаў, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы санаторыя-прафілакторыя БДУ, капітальны рамонт спартыўна-аздараўленчага комплексу "Брыгантіна", правядзенне мерапрыемстваў па паляпшэнні ўмоў працы, захады па ўдасканаленні навучальнага працэсу: размеркаванне вучэбнай нагрузкі так, каб навучанне не аказвала адмоўнага ўздзеяння на здароўе студэнтаў, вялікі блок пытанняў псіхалагічнага здароўя студэнтаў і супрацоўнікаў, арганізацыя дыетычнага харчавання студэнтаў і многае іншае.

Калі ўсё гэта будзе рэалізавана, то мы зможам значна паправіць здароўе нашых студэнтаў за час навучання.

Ганна ЛАГУН

ВІНШУЕМ!

"Сава" для ліцэістаў

Рэспубліканскі інтэлектуальны фестываль "Кубак Кронана" прайшоў 6—7 лістапада ў Гродне. Фестываль ладзіцца з 2001 г. і ўжо стаў добрай традыцыяй.

"Кубак Кронана" — самы знакаміты з усіх інтэлектуальных турніраў сярод школьнікаў, якія праводзяцца ў Беларусі. Сёлета Гродна прымала 40 дзіцячых камандаў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Па выніках трох асноўных гульняў "Мудрую Саву" — галоўны прыз фестывалю атрымала каманда ліцэя БДУ "Дурол". Трэніруе каманду Сцяпан Цемушаў, які на сённяшні дзень з'яўляецца найлепшым трэнерам Беларускай лігі інтэлектуальных камандаў. Гэтае званне ён паспяхова пацвярджае: "Мудрая Сава" паехала з Гродна ў Мінск ужо другі раз запар.

Алена ШЫБУТ

ЮБІЛЕІ

Філалагічны факультэт адзначыў 65-годдзе

Філалагічны факультэт БДУ адзначыў 65-ю гадавіну з дня свайго заснавання. У рамках святкавання 16 лістапада адбылася сустрэча рэктара БДУ прафесара В.І. Стражава з ветэранамі філфака. Галоўныя святкаванні адбыліся 17 лістапада. У гэты дзень прайшоў студэнцкі конкурс "Філалогія і я", адбылося адкрыццё кабінета беларускай філалогіі на факультэце. На адкрыцці кабінета, які стане цэнтрам навукова-метадычнай работы і патрыятычнага выхавання студэнтаў, а таксама своеасаблівым музеем, выступіў В.І. Стражаў. Завяршэннем святкавання стала юбілейная ўрачыста-лірычная вечарына, на якой выступілі госці — выпускнікі факультэта, дэканы іншых факультэтаў БДУ. Канцэртную праграму паказалі творчыя калектывы філалагічнага факультэта.

КАНФЕРЭНЦЫІ

Філасофія І. Канта і сучаснасць

Міжнародная навуковая канферэнцыя «Філасофія І. Канта і сучаснасць» адбылася 19—20 лістапада на факультэце філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Канферэнцыя прысвячалася 280-годдзю з дня нараджэння і 200-годдзю з дня смерці выдатнага нямецкага філосафа Імануіла Канта (1724—1804). Даты яго жыцця і смерці ўключаны ў каляндар ЮНЕСКА, а 2004 год названы годам Канта і шырока адзначаецца ў свеце.

Навуковы форум адкрылі першы прарэктар нашага універсітэта прафесар С.К. Рахманаў, намеснік Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ФРГ у Беларусі, саветнік пасольства Ян Канторчык, а таксама саветнік сакратарыята Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА А.І. Красоўская. Удзел у канферэнцыі прынялі філосафы і культуролагі з усіх ВНУ і рэгіёнаў Беларусі, а таксама прадстаўнікі Расіі, Літвы, Польшчы, Германіі, Украіны. Адбыліся пленарныя пасяджэнні. Навукоўцы таксама працавалі па секцыях «І. Кант і лёс філасофіі ў сучаснай культуры», «Рэцэпцыя ідэй І. Канта ў культурных традыцыях Захаду і Усходу», «Сацыяльна-палітычная дактрына І. Канта і парадыгмы эпохі глабалізацыі». Акрамя таго, адбыўся круглы стол «І. Кант і праблема спецыфікі духоўна-маральнага развіцця ўсходнеславянскай цывілізацыі».

Арганізатарамі канферэнцыі выступілі БДУ, Інстытут філасофіі НАН Беларусі пры ўдзеле Пасольства Германіі ў Беларусі і пад эгідай Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА.

Іван ФЕДАРОВІЧ

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Беларуска-шведскі семінар

Беларуска-шведскі семінар "Bridging Belarus and Sweden" адбыўся 15—16 лістапада ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Ініцыятарам мерапрыемства з шведскага боку выступіў Шведскі інстытут, у складзе яго дэлегацыі ўдзельнічалі 43 чалавекі. Беларусь была прадстаўлена 60 удзельнікамі з усіх рэгіёнаў краіны, у тым ліку работнікамі агульнаадукацыйных школ, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установаў, а таксама тых, дзе займаюцца адукацыяй для дарослых.

Асноўная мэта семінара — усталяванне і ўмацаванне кантактаў у галіне адукацыі ва ўсіх сферах, уключна з прыродазнаўчымі і сацыяльна-гуманітарнымі напрамкамі. Абмеркаванні дакладаў і прэзентацыя праектаў адбылася падчас пленарных пасяджэнняў і круглых сталоў.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Навукоўцы БДУ ў Шанхаі

У выніку папярэдне праведзенай работы па падрыхтоўцы ўзелу дэлегацыі БДУ ў Шанхайскім міжнародным прамысловым кірмашы SIF—2004, у перыяд з 4 па 9 лістапада ў Шанхаі, а таксама ў Харбіне і Чжэньчжоў адбыліся перагаворы з прадстаўнікамі дзелавога кітайскага свету і кіраўнікамі дзяржаўных органаў кіравання ў навукова-тэхнічнай сферы. Пра гэта "Беларускаму універсітэту" паведаміў першы прарэктар нашага універсітэта прафесар Сяргей Кімавіч Рахманаў.

Так, у Харбіне (правінцыя Хэйлунцзян) адбыліся перагаворы з начальнікам дэпартамента навукі і тэхналогій правінцыі, на якіх была дасягнута дагаворанасць пра стварэнне беларуска-кітайскага тэхнапарку на базе БДУ з удзелам кітайскіх прадпрыемстваў. Акрамя таго, быў падпісаны дагавор з Харбінскім навукова-тэхнічным універсітэтам аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі і навукі.

У Чжэньчжоў адбыліся перагаворы з начальнікам дэпартамента навукі і тэхналогій правінцыі Хэнань, на якіх таксама была дасягнута дагаворанасць пра стварэнне беларуска-кітайскага тэхнапарку на базе БДУ з удзелам кітайскіх прадпрыемстваў. Апрача таго, было падпісана пагадненне з адным з найбуйнейшых у Кітаі прадпрыемстваў — АТ "Белы голуб", пра стварэнне сумеснага прадпрыемства па выпуску рэжучых інструментаў на аснове штучных алмазаў, якія выпускае УП "Адамас-БДУ".

Непасрэдна ў Шанхаі па запрашэнні кітайскага боку адбылося наведванне Шанхайскага цэнтра трансферу міжнародных тэхналогій і па выніках перагавораў былі падпісаныя дагаворы аб супрацоўніцтве ў галіне сучасных інфармацыйных тэхналогій, а таксама аб удзеле гэтага цэнтра ў беларуска-кітайскім тэхнапарку на базе БДУ.

Акрамя таго, адбыліся перагаворы з прэзідэнтам кампаніі Shanghai Grand Medical Equipment Company, якая спецыялізуецца на вырабе медыцынскага абсталявання. Была дасягнута дагаворанасць пра падрыхтоўку і падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве ў галіне распрацоўкі і рэалізацыі на кітайскім рынку лазернага абсталявання хірургічнага прызначэння і новых лекавых сродкаў.

На перагаворах з генеральным дырэктарам Нанкінскай кампаніі супрацоўніцтва і развіцця па тэхніцы Know-How была дасягнута дагаворанасць пра падрыхтоўку і падпісанне Дагавора аб супрацоўніцтве па трансферы НТП БДУ на кітайскім рынку.

Падчас працы Шанхайскага міжнароднага прамысловага кірмашу прадстаўнікі больш як 20 кітайскіх арганізацый выявілі цікавасць да такіх распрацовак БДУ, як лазерныя сістэмы і прылады медыцынскага прызначэння, новыя хімічныя і лекавыя прэпараты, сродкі для аховы навакольнага асяроддзя і інш. Па выніках дзелавых сустрэч падпісаныя тры пратаколы пра намеры з Шанхайскім аддзяленнем Акадэміі навук Кітая.

Задачы, якія планавала вырашыць дэлегацыя БДУ падчас свайго ўдзелу ў кірмашы SIF—2004, вырашаныя. Дасягнутыя вынікі ацэньваюцца як дадатныя.

Таццяна КУХАРЧУК

ВІНШУЕМ!

Падведзены вынікі

17 лістапада 2004 г. камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі БДУ правёў падвядзенне вынікаў конкурсу літаратурных твораў, прысвечаных 83-й гадавіне нашага універсітэта. Па выніках былі выяўлены пераможцы — Крысціна Карчэўская (I курс фізічнага факультэта) і Вольга Ківель (III курс філалагічнага факультэта).

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Бібліятэка запрашае

Конкурс інавацый і ідэй супрацоўнікаў аддзела абслугоўвання адбудзецца 3 снежня 2004 г. Конкурс пачаўся 31 кастрычніка, і 3 снежня адбудзецца фінал: падрыхтоўка і абарона "хатняга задання", удзел у аглядзе "Ступені майстэрства". Мэта мерапрыемства — выявіць свежыя плённыя ідэі ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, паспрыяць укараненню новых бібліятэчна-інфармацыйных паслуг і прадукцыі, спосабаў іх выкарыстання; зрабіць дасяжненні і навацыі набыткам прафесійнай грамадскасці, раскрыць прафесійныя якасці і творчы патэнцыял супрацоўнікаў аддзела абслугоўвання бібліятэкі і г.д.

Супрацоўнікі бібліятэкі будуць радыя вітаць гасцей у 9.00 у 433-й аўдыторыі галоўнага корпуса.

КАНФЕРЭНЦЫІ

Фізікі сабраліся ў БДУ

Міжнародная IX штогадовая канферэнцыя Супрацоўніцтва Расіі і іншых краін-удзельніц Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (АІЯД, Дубна, Расія) у праекце CMS адбылася ў Мінску 28 лістапада — 2 снежня на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел каля 120 фізікаў і інжынераў з Еўрапейскай лабараторыі фізікі часціц (ЦЕРН, Швейцарыя — Францыя; аб'ядноўвае 20 краін), АІЯД (аб'ядноўвае 18 краін), а таксама шэрага вядучых інстытутаў і універсітэтаў Беларусі, Балгарыі, Германіі, Італіі, Расіі, ЗША, Украіны, Францыі, Швейцарыі. Урачыстае адкрыццё канферэнцыі адбылося 29 лістапада ў зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ.

Навукоўцы з БДУ ў супрацоўніцтве з навукоўцамі з іншых краін вядуць працу над праектам CMS (кампактны мюонны саленоід), які не мае аналагаў у гісторыі навукі і тэхнікі. Ён важыць каля 15 т, мае ў даўжыню амаль 22 м, у вышыню раўняецца з 5-павярховым домам і каштуе каля паўмільярда долараў. CMS спалучае ў сабе практычна ўсе найноўшыя дасягненні навукі, тэхнікі і індустрыі, ён нашмат больш складаны, чым атамная падлодка ці касмічны карабель. У гэтым праекце ўдзельнічаюць каля 20 навукоўцаў з нашага універсітэта, інстытутаў БДУ і некаторых іншых навукова-вытворчых арганізацый Беларусі. Усяго ж на сённяшні дзень у праекце занята больш за 2000 спецыялістаў з 167 інстытутаў 37 краін свету. Абмеркаванню пытанняў, звязаных з CMS, і прысвячалася маштабная навуковая канферэнцыя.

Падрыхтавала Юлія ПЯТРОВА

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Пагадненні з Латвійскім універсітэтам

Пагадненне пра супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Латвійскім універсітэтам падпісана ў Рызе ў рамках правядзення ў сталіцы Латвіі 4—7 лістапада Нацыянальнай выставы "БеларусьЭКСПА — 2004". У цырымоніі прыняла ўдзел дэлегацыя БДУ на чале з намеснікам першага прарэктара па навуковай рабоце — начальнікам Галоўнага ўпраўлення навукі БДУ, доктарам фізіка-матэматычных навук С.А. Максіменкам.

Пагадненне прадугледжвае арганізацыю сумесных навуковых даследаванняў, канферэнцый і семінараў, абмен публікацыямі, навукова-тэхнічнай і метадычнай літаратурай, перыядычнымі выданнямі і інш.

У навукова-тэхнічнай сферы асаблівую цікаўнасць у абодвух бакоў выклікае супрацоўніцтва па такіх кірунках, як фізіка і хімія новых матэрыялаў і нанаструктур, оптыка і спектраскапія, лазерная фізіка, гісторыя, культура, геаэкалогія і прыродакарыстанне ў памежных абласцях і Балтыйскім рэгіёне. Акрамя таго, у рамках пагаднення будзе ажыццяўляцца абмен студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі і дактарантамі, выкладчыкамі і супрацоўнікамі ВНУ, аказанне ўзаемнай дапамогі ў павышэнні кваліфікацыі навукоўцаў і выкладчыкаў; абмен вопытам у арганізацыі кіравання якасцю адукацыі і новых метадаў навучання.

Пэўныя крокі па рэалізацыі падпісанага дакумента зроблены ўжо падчас знаходжання дэлегацыі БДУ ў Рызе. Адбыліся перагаворы з навукоўцамі хімічнага і біялагічнага факультэтаў Латвійскага універсітэта па сумесных даследаваннях у галіне распрацоўкі ўзбагачальных харчовых дабавак і біяхіміі хлебапячэння. Была дасягнута дагаворанасць з прадстаўнікамі геаграфічнага факультэта гэтай ВНУ пра ажыццяўленне сумеснага праекта па даследаванні культуры, гісторыі і геаэкалогіі Браслаўска-Латгальскай азёрнай сістэмы, а таксама сумеснай магістэрскай праграмы па метэаралогіі і кліматалогіі на базе Цэнтра маніторынгу азонасферы і кафедры агульнага землязнаўства БДУ.

Таксама адбылася сустрэча з прадстаўніком Латвіі па 6-й Рамачнай праграме Альбертасам Убелісам. Размова на ёй ішла пра супрацоўніцтва ў галіне стварэння сістэмы маніторынгу і арганізацыі міжуніверсітэцкай (БДУ і Латвійскі універсітэт) інфармацыйнай сеткі.

Развіццю двухбаковых кантактаў спрыяла і правядзенне сумеснай навукова-практычнай канферэнцыі "Беларуска-латвійскае супрацоўніцтва ў сферы навукі і інавацый як важны фактар забеспячэння росту нацыянальных эканомік".

Асабліва варта адзначыць удзел БДУ ў Нацыянальнай выставе "БеларусьЭКСПА — 2004". БДУ на ўласным стэндзе прадставіў 40 экспанатаў, а таксама інфармацыю па 260 распрацоўках навукова-тэхнічнай прадукцыі універсітэта. Раздзелы экспазіцыі ўключалі наступныя напрамкі: ЗВЧ-тэхніка, аналітычныя і кантрольна-вымяральныя сістэмы і прылады, абсталяванне для вытворчасці матэрыялаў і вырабы з іх, водныя экасістэмы, маніторынг прыземнага азону і УФ-выпраменьванняў, узбагачальныя харчовыя дабаўкі і паляпшальнікі хлябоў, біятэхналогіі (біяпаліва на аснове рапсу), новыя матэрыялы, тэхналогіі і абсталяванне ў галіне аховы здароўя і хімічнай вытворчасці. Прадукцыя універсітэта выклікала вялікую цікавасць праз сваю канкурэнтаздольнасць і цэнавыя перавагі. Была праведзена серыя перамоваў з дзелавымі партнёрамі пра яе пастаўкі на латвійскі рынак.

Падрыхтавала Юлія ПЯТРОВА

У ВОЛЬНЫ ЧАС

Успаміны пра «F-ART.BY»

З 17 па 20 лістапада 2004 года Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь разам з Нацыянальным цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі праводзілі ў Мінску Фестываль творчасці замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Фестываль, які атрымаў назву «F-ART.BY», упершыню праводзіўся ў мінулым годзе. Але тады ён быў далёка не такі маштабны, бо ў праграме ўдзельнічалі прадстаўнікі толькі мінскіх навучальных устаноў. Сёлета ў фестывалі прынялі ўдзел дэлегацыі замежных студэнтаў з 18 вышэйшых навучальных устаноў краіны — прадстаўнікі 26 краін свету.

Упершыню ў праграме фестывалю праводзіліся:

акцыя "Мірная Беларусь з моладдзю свету" ў шэрагу ВНУ сталіцы (БДУ, БДУК, МДЛУ, БДАМ, БДТУ, БДПУ);

прэзентацыя СМІ вышэйшых навучальных устаноў Беларусі;

круглы стол з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ "Міжкультурныя зносіны. Сучасныя тэндэнцыі і праблемы. Сацыяльна-культурная дзейнасць як выхаваўчае і камунікатыўнае асяроддзе";

конкурс тэматычных праграм "Мы — розныя, але ж мы разам!"

Акрамя таго, госці фестывалю маглі пазнаёміцца з разнастайнымі мастацкімі вырабамі, стравамі нацыянальнай кухні, традыцыйным мастацтвам і сучаснай творчасцю студэнтаў.

Зараз у вышэйшых навучальных установах Беларусі атрымліваюць адукацыю больш за 4500 чалавек з 75 краін СНД, Балтыі і далёкага замежжа. Наша дзяржава надае пільную ўвагу пытанням, якія звязаны з маладзёжнай культурай. Таму мерапрыемствы фестывалю праходзілі з удзелам прадстаўнікоў дыпламатычнага корпуса.

"F-ART.BY" аб'яднаў усіх удзельнікаў у жаданні паказаць і падарыць гледачам найлепшыя праявы культуры, звычаяў і традыцый розных народаў. У кожнага з удзельнікаў фестывалю ёсць свая радзіма, якой ён ганарыцца, культуру якой ён паважае. Фестываль сабраў таленавітую моладзь, падараваў студэнтам-замежнікам радасць новых знаёмстваў, дапамог ім адкрыць для сябе нешта новае. Такія фестывалі — добрая магчымасць зрабіць уклад у фарміраванне інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу моладзі ўсяго свету.

Большасць замежных студэнтаў, якія зараз навучаюцца ў Беларусі, пасля заканчэння ВНУ збіраюцца вярнуцца на сваю радзіму. Але дзякуючы ім нашу краіну будуць ведаць у свеце яшчэ больш і яшчэ лепш.

Алена ШЫБУТ

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Студэнты-географы на кангрэсе

Сёлета ўвосень беларускія студэнты-географы ўпершыню ўдзельнічалі ў штогадовым кангрэсе EGEA — Еўрапейскай геаграфічнай асацыяцыі, якая ўтварылася ў 1998 г. і сёння аб'ядноўвае каля 30 краін. Кангрэс, дзе былі прадстаўлены 25 краін Еўропы, адбываўся ў г. Барла (правінцыя Лімбург, Нідэрланды). Арганізатарам яго выступіў Утрэхцкі універсітэт.

Праца форуму адбывалася па секцыях — "Партова-прамысловыя комплексы", "Марскія ўзбярэжжы", "Марфалогія рачной даліны", "Водны турызм" і інш. Беларускія географы ўдзельнічалі ў працы дзвюх секцый, на якіх уздымаліся найбольш актуальныя для нашай краіны пытанні — "Водна-балотныя ўгоддзі" і "Асушальная меліярацыя".

Апрача агульных лекцый і іншых мерапрыемстваў, дзе большасьць была слухачамі ці гледачамі, былі і такія, дзе ўдзельнікі маглі паказаць сябе ў найлепшым святле. У адзін з вечароў паказвалі народныя танцы, гулялі ў нацыянальныя гульні, елі прысмакі з усіх краін Еўропы. Беларусы выявіліся падрыхтаванымі лепш за ўсіх: мы адны прывезлі на конкурс сапраўдныя нацыянальныя строі і глядзеліся падчас танцаў стылёва і эфектна. А яшчэ паказалі навукова-папулярны фільм пра некранутую прыроду ў сэрцы Еўропы.

Так і фарміруецца ў замежнікаў вобраз Беларусі. Яны хацелі наведаць нашу краіну і супрацоўнічаць з намі. Магчыма, у нас удасца арганізаваць рэгіянальны кангрэс EGEA. Нездарма ж мы геаграфічны цэнтр Еўропы!

Юлія АЛЯКСЕЙЧЫК, Марыя МАНДРЫК

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Факультэт журналістыкі святкуе юбілей

2 снежня, пачатак у 10.00. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Журналістыка — 2004" (вул. Ленінградская, 16, корпус геаграфічнага факультэта, канферэнц-зала, 3-і паверх).

3 снежня, пачатак у 11.00. Урачыстае пасяджэнне Вучонага савета факультэта журналістыкі (вул. Маскоўская, 15, актавая зала).

3 снежня, пачатак у 16.00. Урачысты сход з нагоды 60-годдзя факультэта журналістыкі (вул. Ульянаўская, 8, ліцэй БДУ, канферэнц-зала).

4 снежня, пачатак у 16.00. Студэнцкі форум "Мы родам з журфака" (Нацыянальны цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, вул. Фабрыцыуса, 5). У праграме мерапрыемства творчая сустрэча з славутымі выпускнікамі, студэнцкі капуснік, канцэрт з удзелам зорак беларускай эстрады і дыскатэка.

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАУ

Па выніках практыкі

У сярэдзіне лістапада на факультэце журналістыкі адбылася традыцыйная канферэнцыя па выніках практыкі. На гэты раз яна насіла не толькі практычны, але яшчэ і навуковы характар. Падчас канферэнцыі працавалі 5 круглых сталоў па такіх тэмах, як "Беларускі друк для дзяцей і падлеткаў: тэорыя і практыка", "Міжнародная тэматыка ў СМІ", "Практыка падрыхтоўкі медыяспецыялістаў", "Выдавецкая справа ў Беларусі: перспектывы і праблемы", "Практыка на заводскім і рэгіянальным радыё — пачатак і аснова прафесіі электроннага журналіста". Адбылася таксама творчая сустрэча "Жаночы твар у беларускай журналістыцы". Многія студэнты зацікавіліся творчай сустрэчай з Ягорам Хрусталёвым — генпрадзюсерам АНТ, вядучым ток-шоу "Выбар".

Такая форма канферэнцыі па выніках практыкі была арганізавана ўпершыню. Найлепшыя студэнты былі ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі, прэміямі і граматамі.

Алена КУРХІНЕН

КАНФЕРЭНЦЫІ

Мова і соцыум

Міжнародная навуковая канферэнцыя "Мова і соцыум" адбудзецца 3—4 снежня на філалагічным факультэце БДУ. Яе ўжо шосты раз арганізуе кафедра прыкладной лінгвістыкі факультэта. Упершыню такі форум пройдзе пад эгідай Міжнароднай асацыяцыі выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры (МАПРЯЛ), у якую ўваходзяць 80 дзяржаваў. Сярод арганізатараў мерапрыемства таксама Міністэрства адукацыі Беларусі, Беларускае грамадскае аб'яднанне выкладчыкаў рускай мовы замежнікам, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт. У канферэнцыі прымуць удзел 260 навукоўцаў з нашай краіны, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі, Швецыі, Кітая і Турцыі.

На пленарных пасяджэннях і падчас працы 12 секцый будзе разгледжана шырокае кола пытанняў, у тым ліку праблемы моўнай сітуацыі і моўнай палітыкі ў розных рэгіёнах свету, аналіз палітычнага дыскурсу і мовы сродкаў масавай інфармацыі, суадносіны мовы і культуры і г.д.

Адкрыццё канферэнцыі адбудзецца 3 снежня ў 11.00 у аўдыторыі 304 філалагічнага факультэта.

Іван ФЕДАРОВІЧ

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Студэнцкія абмены

Пяць студэнтаў-чацвёртакурснікаў і выкладчык эканамічнага факультэта А. Церашкоў 8—11 лістапада наведалі універсітэт горада Эйндховен (Нідэрланды) па праграме студэнцкіх абменаў. Падчас візіту студэнты нашага універсітэта наведалі вядучыя кампаніі краіны — BOVA, KVERNELEND, ZYMON, а таксама прынялі ўдзел у спецыяльна арганізаваных занятках універсітэта Fontys.

Атрыманую інфармацыю ўдзельнікі паездкі павінны прадставіць на працягу снежня на прэзентацыях на эканамічным факультэце БДУ. Кожная з прадстаўленых на прэзентацыі фірмаў зацікаўленая ў ацэнках, якія будуць агучаны падчас прэзентацый. Рынкі Усходняй Еўропы з'яўляюцца вельмі прывабнымі для заходніх вытворцаў, таму іх цікавіць нашае меркаванне. А для студэнтаў эканамічнага факультэта вопыт практычнай працы па прымяненні ведаў таксама вельмі карысны.

А. ЦЕРАШКОЎ,
дацэнт, намеснік дэкана па міжнародных сувязях

ЮБІЛЕІ

ФАКУЛЬТЭТУ ЖУРНАЛІСТЫКІ — 60 ГАДОЎ!

Творчы патэнцыял беларускай журналістыкі

Факультэту журналістыкі БДУ — 60 гадоў. 60 прыступак узыходжання на вышыню навуковай, вучэбнай, метадычнай сталасці.

Творчую вышыню факультэта сёння ўвасабляюць 56 выпускаў і 5858 студэнтаў-выпускнікоў, Саюз журналістаў Беларусі, значная колькасць членаў Саюза пісьменнікаў. "Залатыя пёры" выхаванцаў журфака шчыруюць у 1500 перыядычных выданнях, на тэлеканалах і радыёстанцыях, у прэс-цэнтрах і прэс-службах, у рэкламных агенцтвах і службах па сувязях з грамадскасцю.

...Пасля вызвалення Беларусі ад фашыстаў ЦК ВКП(б) 9 жніўня 1944 года прымае пастанову аб адкрыцці ў БДУ факультэта журналістыкі. Гэтай жа дырэктывай прадпісвалася арганізацыя журфакаў ва універсітэтах Кіева і Масквы. Калегі крыху спазніліся, і факультэт журналістыкі БДУ быў створаны першым у Савецкім Саюзе. Кіеўскі журфак свой радавод пачаў у 46-м годзе, а маскоўскі — у 47-м.

Першыя спробы журналісцкай падрыхтоўкі меліся на базе губернскіх партшкол у Віцебску ў 1918 годзе і ў Мінску ў 1920-м. З 1932-га па 1941-ы журналісцкія кадры рыхтаваліся ў Мінскім Камуністычным інстытуце журналістыкі (КІЖ) і з 1935 года — у Магілёўскім газетным тэхнікуме. Стварэнне факультэта журналістыкі ва універсітэцкім асяродку сведчыла пра ўваходжанне журналісцкай адукацыі ў рэчышча сусветнай практыкі.

Сёння вектар акадэмічнай палітыкі журфака заключаецца ў далейшым развіцці традыцыйна высокай фундаментальнай падрыхтоўкі, умацаванні творчых сувязяў са сродкамі масавай інфармацыі. Падрыхтавана і ўведзена ў навучальны працэс новае пакаленне навучальных праграм (усяго 83). Абноўлены праграмны матэрыял агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін.

Рэфармаванне журналісцкай адукацыі было выклікана пераўтварэннямі ў сацыяльным, палітычным жыцці грамадства. Асноўны цяжар гэтай мэтанакіраванай працы вынес "штаб" намеснікаў дэкана — А.А. Рудэнка, Я.І. Дзмітрыеў, Т.І. Прановіч, А.І. Конанава; новы склад загадчыкаў кафедраў — А.К. Своораб, Л.П. Саянкова, В.Р. Булацкі, Т.М. Дасаева, В.І. Іўчанкаў, В.Р. Вашкевіч, П.Л. Дарашчонак, І.Ф. Ухванава; члены Вучонага савета, асабліва прафесары-настаўнікі Б.В. Стральцоў, І.І. Сачанка.

Сёння і выдаўцы, і заснавальнікі, і галоўныя рэдактары дружна фіксуюць дасягнуты баланс попыту і прапаноў у журналісцкай адукацыі. Факультэту ўдалося ўстанавіць "кансенсус" паміж тэарэтычным навучаннем і практычнай запатрабаванасцю сучаснага медыяпрацэсу. Падрыхтоўка вядзецца ў рэальных рэдакцыйных умовах. Амаль на кожнай спецыяльнай дысцыпліне студэнты ўвасабляюць тэарэтычныя веды ў матэрыялы газет і часопісаў, перадачы радыё і тэлебачання. Скразны курс "Журналісцкага майстэрства", заняткі па 20 профілях у творчых майстэрнях замацоўваюць практычны аспект універсітэцкага сталення.

Факультэт скіроўвае навучальны працэс на падрыхтоўку шырока адукаваных спецыялістаў, здольных адаптавацца да разнастайных рэдакцыйных умоў. У часе навучання студэнты праходзяць вучэбна-азнаямляльную практыку, тры вытворчыя і адну пераддыпломную. Творчая справаздача аб практычнай падрыхтоўцы выносіцца першым пытаннем у білеце на дзяржаўным экзамене.

А пачатак гэтай карпатлівай працы — у "селекцыйным" наборы таленавітай і прафесійна арыентаванай моладзі. Спарадычнаму рэлетытарству альтэрнатываў з 1997 г. сталі падрыхтоўчыя курсы пры факультэце. За 7 год праз вячэрнюю абітурыенцкую майстэрню прайшло каля 500 чалавек.

Прафарыентацыю навучэнцаў дапоўнілі творчым конкурсам "Абітурыент журфака" ў маладзёжных выданнях ("Чырвоная змена", "Переходный возраст", "Знамя юности", "Репетитор"). Праз творчае спаборніцтва апрабавана да 1000 выпускнікоў школ.

Выкладчык журфака — гэта практыкуючы трэнер. Таму факультэт арганізаваў штогадовую творчую стажыроўку ўсіх выкладчыкаў у СМІ. Нельга ў гэтай сувязі не ўзгадаць і курсы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў кнігавыдання і СМІ. Прайшлі перападрыхтоўку ў нас спецыялісты па дызайне і камп'ютарнай вёрстцы газет і часопісаў; творчыя работнікі шматтыражных газет; літрэдактары выдавецтваў; супрацоўнікі раённага радыёвяшчання і г.д.

Калектыў журфака стаў першапраходцам у БДУ па ўкараненні новых актыўных метадык выкладання вучэбных дысцыплін і паступовым пераходзе на ўзроўневую падрыхтоўку спецыялістаў. На факультэце паспяхова ўкаранілі рэйтынгавую сістэму ацэнкі ведаў студэнтаў.

У 1996 годзе на журфаку налічвалася 32 бюджэтныя адзінкі выкладчыкаў і 6 чалавек працавалі з аплатай са спецсродкаў, а сёння ў нас 81 адзінка прафесарска-выкладчыцкага складу. Навучальны працэс ажыццяўляюць 122 чалавекі. Кваліфікацыйны ўзровень таксама падвоіўся: у 1998 г. у нас працавалі 5 дактароў навук і 23 кандыдаты, сёння — 10 дактароў і 49 кандыдатаў навук. Тры прафесары носяць ганаровае званне: М.Я. Цікоцкі — "Заслужаны дзеяч адукацыі", Е.Л. Бондарава — "Заслужаны дзеяч навукі", Б.В. Стральцоў — "Заслужаны дзеяч культуры". Званні "Выдатнік друку Беларусі" маюць 9 чалавек, "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь" — 8 выкладчыкаў. Дацэнты С.В. Говін, М.П. Карповіч і А.А. Рудэнка маюць абодва гэтыя званні. Дацэнт Н.А. Сніцарава — лаўрэат прэміі Саюза журналістаў.

Дзейсным сродкам умацавання рэдакцыйнага і журфакаўскага супрацоўніцтва стала стварэнне 5 філіялаў кафедраў: перыядычнага друку — у рэдакцыі "Рэспублікі", сацыялогіі журналістыкі — у "Звязде", радыёвяшчання і тэлебачання — у АТН, замежнай журналістыкі і літаратуры — у "Голасе Радзімы", тэхналогій камунікацыі — у Нацыянальным прэс-цэнтры.

Стваральны падыход калектыву журфака да падрыхтоўкі спецыялістаў пацвердзілі вынікі 6 атэстацыйных тураў за апошнія 2,5 года, праведзеных камісіямі па кантролі за якасцю адукацыі, а таксама стварэнне "з нуля" на аснове студэнцкіх калектываў радыё "Мінск", газеты "Минский курьер", тэлекампаній "АНТ" і "СТБ" і інш.

Факультэт штогод адкрывае новыя спецыяльнасці. Таленавітая творчая моладзь Беларусі сёння мае магчымасць выбіраць з спецыяльнасцей "журналістыка", "міжнародная журналістыка", "інфармацыя і камунікацыя", "літаратурная работа". Класічная спецыяльнасць "журналістыка" сёння рэалізуецца па двух кірунках — "аўдыёвізуальная журналістыка" і "друкаваныя СМІ".

Для паляпшэння тэхналагічнай і тэхнічнай узброенасці сучаснага журналіста факультэт стварыў Вучэбны цэнтр камунікацыйных тэхналогій, у склад якога ўваходзяць лабараторыі: фотажурналістыкі, выдавецкая, інфарматыкі і мультымедыя, аўдыёвізуальная.

Вынікі дзейнасці сумеснага творчага калектыву кафедры сацыялогіі журналістыкі і Цэнтра сацыяльна-палітычных даследаванняў БДУ пакладзены ў аснову дырэктыўных дакументаў Міністэрства інфармацыі па развіцці сістэмы СМІ Беларусі. Факультэт — асноўны распрацоўшчык Дзяржаўнай праграмы "Распрацоўка навуковых асноў ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці". Пададзеная на конкурс дзяржаўных праектаў фундаментальных даследаванняў міжкафедральная праграма "Узаемадзеянне дзяржаўных і недзяржаўных СМІ" заняла першае месца ў БДУ. Тэма "Даследаванне беларускай мовы на мяжы тысячагоддзяў" уключана ў Дзяржаўную праграму фундаментальных даследаванняў у сістэме гуманітарных навук на 2001—2005 гады.

За апошнія 5 гадоў надрукавана 68 навучальных дапаможнікаў, 22 манаграфіі, 9 навуковых зборнікаў, 1118 навуковых артыкулаў і тэзісаў дакладаў. Толькі ў 2003 годзе выйшлі ў свет 332 навуковыя публікацыі агульным аб'ёмам 385 друкаваных аркушаў.

За 5 апошніх гадоў абаронена 24 дысертацыі — пятая частка ўсіх кваліфікацыйных прац, абароненых за 60 гадоў існавання факультэта. Гэта дазволіла ўпершыню на журфаку ў 2000 г. стварыць "доктарскі" Савет па абароне дысертацый, што прастымулявала паспяховую абарону 4 доктарскіх дысертацый — вельмі жаданых пасля 15-гадовага тайм-аўта.

За апошнія 5 гадоў адбыліся 23 навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі. Закладзена традыцыя правядзення Міжнародных навукова-практычных канферэнцый. Сёлета 6-я з іх — Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка — 2004».

Творчая дзейнасць калектыву, спадзяемся, стане больш плённай, калі зменяцца матэрыяльна-тэхнічныя і прасторавыя ўмовы журфакаўскага існавання. Самай балючай праблемай застаецца будынак. Дакладней, яго адсутнасць: сёння на кожнага студэнта прыпадае 0,5 кв.м навучальнай плошчы.

З дасягненнямі, здабыткамі і праблемамі калектыў святкуе сваё 60-годдзе. Пік яго творчага сталення наперадзе!

В. П. ВАРАБ'ЁЎ,
дэкан факультэта журналістыкі, загадчык кафедры сацыялогіі журналістыкі БДУ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

30 лістапада 2004 года, №№ 20-21 (19051906)

АСОБЫ

Ластаўка і тыя, што сядзяць

Пісаць пра карціны і мастакоў — зусім не тое, што пісаць аб праблеме грошай і спосабах яе вырашэння. Ахвотных чытаць будзе менш. Калі хвалюе матэрыяльны свет, духоўны проста здзіўляе. І не таму, што ён дзівіць чалавека сам па сабе, а таму што ён не спазнаны. Калі не ведаеш сваёй душы, наўрад ці захочацца стаяць перад палатном, куды ўкладзена чужая.

Спярша я пазнаёмілася з мастачкай Наталляй Рачкоўскай, а потым з яе карцінамі, прадстаўленымі на выставе "Кантраст". І здзівілася, што намалявала іх яна. Жанчына, якая так шмат гаворыць пра дабрыню, якая многім падаецца глупствам. Карціны былі настолькі напоўненыя сэнсам, што менавіта дабрыня бачылася найбольш сэнсоўнай і важнай.

Для таго каб зразумець палотны, прадстаўленыя на выставе "Кантраст", трэба быць жанчынай, напярэдадні пагаварыць з мужчынам, прыйсці да высновы, што ён разумее толькі сябе, а цябе і надалей збіраецца бачыць так, як гэта зручна яму. І ўбачыць гэтыя карціны, на якіх паказаны таксама жанчыны і таксама зручныя для мужчынскага разумення. Але ў іх прывабнай, нічым не прыхаванай плоці адчуваецца душа. У кожнай клетачцы. Яна афарбоўвае цела жанчыны то ў зялёны, то ў сіні, то ў карычневаты колер. І разумееш, што яна адчувае, калі ўздымае рукі, каб прыбраць з плячэй валасы, калі падстаўляе сябе пад гарачае сонца, калі ловіць на сваім твары апошні промень сонца падчас заходу ці адпачывае ў паўдзённую спёку, вольна ляжачы на дыване і не зважаючы на надакучлівую муху, а вось яна сядзіць у пустой кватэры — без вопраткі, але зусім сабраная... Жыве душа, і ажывае цела. І не наадварот. Ці заўсёды гэта зручна разумець?

Наталля Рачкоўская кажа, што на незадаволенае пытанне мужчыны, як так можна маляваць жанчыну, яна адказала, што малюе тое, што лепш ведае. Дарэчы, назва "Кантраст" была абраная для выставы таму, што на процілеглай сценцы можна было ўбачыць намаляваныя мастачкай ружы, астры, старую хвою, вясковую хату, вогнішча...

Ці заўжды мы разумеем сябе, ці заўжды імкнемся спазнаць сябе, не абмяжоўваючы свае намеры пачуццём віны? Ці заўжды гэтаму спадарожнічае каханне? Наталля Рачкоўская малюе цэлымі серыямі. Адна з іх — "У пошуках раўнавагі", у якую ўваходзіць карціна "Азірніся з любоўю", падказвае нам, што расчараванняў не бывае. Існуе непрыняцце сітуацый. А на свае памылкі заўсёды трэба глядзець з любоўю, бо менавіта яны раскрываюць нам вочы. І без гэтага разумення нашае жыццё ператвараецца ў трохкутнікі, квадраты, кубы мадэрнізму, сярод якіх не праглядаецца фігура чалавека.

Гэта пазней з'явіліся такія карціны, як "Руковае пачынае і выйграе", "Светлячок", "Размова", "Успамін пра мора", "Забарона на поўню", "Хлоя" і шмат-шмат іншых. Назвы мастачцы прыходзяць на розум адразу — думаць над імі не даводзіцца.

Усе працы Наталі Рачкоўскай — сведчанні працэсу яе асобаснага развіцця. На пытанні, якія ў яе ўзнікалі, яна адказвала новымі карцінамі. Усю яе творчасць можна назваць постмадэрнісцкай. Але ў гэтых працах праглядаецца і сімвалізм, і рамантызм, і ідэалізм, і фармалізм, і фігуратыўнасць. Мастачку цікавяць кампазіцыя, колер, аб'ём. Яна ў пастаянным пошуку. І для выказвання сваіх думак выкарыстоўвае розныя матэрыялы: алейныя фарбы, пастэль, туш, бялілы, звычайны аловак і інш.

Карціна "Ластаўка" заваражыла мяне з першага погляду: падалося, што гэтая ластаўка — твар чалавека, паказанага на палатне. І менавіта гэтай ластаўкі яму так і не стае. Наталля Рачкоўская прыгадвае, што, назіраючы за ластаўкамі, якія звілі гняздо ў яе на балконе, яна раптам зразумела, што мастак і ёсць ластаўка, і наадварот. Ластаўкі — птушкі, якія практычна ніколі не сядаюць на зямлю.

Сёння Наталля Рачкоўская закончыла новую серыю, якая называецца "Тыя, што сядзяць". Некалькі накідаў карцін з'явіліся ўвадначас і за сціслы тэрмін. Цяпер яе цікавяць аб'ём, пластычнасць, каларыт. І мы можам убачыць, хто ж яны — "тыя, што сядзяць".

Наталля Рачкоўская, старшы выкладчык кафедры мастацтваў Дзяржоўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, выкладае мастацкую пропедэўтыку.

Ёсць такое мудрае выслоўе: спярша рабі патрэбнае, потым карыснае, а толькі потым прыемнае. Наталля Рачкоўская памятае гэта і бярэцца за працу. Яна не толькі малюе карціны, яшчэ любіць ляпіць катоў, вазачкі, сувеніры, стварае скульптуры, мазаікі, вітражы... Такім чынам яна спрабуе зразумець сваю душу і выказаць яе. На роздум пра матэрыяльнае часу застаецца небагата. І гэта не дзіўна. І такія людзі бываюць. І памятаць пра гэта чамусьці прыемна.

Ганна ЛАГУН
Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ

Ад рэдакцыі. *Карціны Наталлі Рачкоўскай можна ўбачыць на выставе «Дыялог» у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (праспект Ф. Скарыны, 47) да 8 снежня.*

АБ'ЯВЫ

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:

дацэнта кафедры гуманітарных дысцыплін (1).

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ "ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА"

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

дацэнта кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін;

старшых выкладчыкаў кафедраў: агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін, дзяржаўна-прававых і крымінальна-прававых дысцыплін, прыродазнаўчых дысцыплін;

выкладчыкаў кафедраў: агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін, дзяржаўна-прававых і крымінальна-прававых дысцыплін, прыродазнаўчых дысцыплін, сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Камсамольская, 21, аддзел кадраў, тэл. 229-29-46.

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

"Вядзьмарыць па-беларуску..."

Ва універсітэце тройчы пабывала самая маладая сяброўка Саюза пісьменнікаў Беларусі, студэнтка III курса факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў 19-гадовая паэтка Валерыя Кустава. На трох факультэтах прайшла прэзентацыя яе першага зборніка паэзіі "Каб неба сагрэць..."

У прадмове да кнігі паэт Рыгор Барадулін так напісаў пра Валерыю: "Паэтка любіць вядзьмарыць словам, — і зазначыў: — Вядзьмарыць па-беларуску".

Валерыя захапіла слухачоў цудоўным выкананнем сваіх песень пад гітару, уразіла і здзівіла не па ўзросце глыбока філасофскім асэнсаваннем жыцця, непаўторнасцю і своеасаблівасцю сваёй паэзіі. Ва універсітэце ў маладой паэткі з'явіліся свае прыхільнікі. Гэта студэнты філалагічнага, хімічнага, юрыдычнага і інш. факультэтаў. І хоць Валерыя Кустава прызналася ў сваім выступленні, што не ўваходзіць у склад ніякіх суполак прынцыпова, яна ўсё ж атрымала запрашэнні наведаць аб'яднанне аматараў паэзіі на юрыдычным факультэце і клуб бардаўскай песні на хімічным факультэце ад кіраўнікоў гэтых суполак.

Ірына ШКІРОНАК,
вядучы бібліятэкар аддзела гуманітарна-асветніцкай работы ФБ БДУ

АКТУАЛЬНА

Справаздачу трымае прафкам

9 лістапада ў актавай зале ліцэя БДУ адбылася 31-я справаздачна-выбарная канферэнцыя пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На ёй прысутнічалі 366 дэлегатаў ад усіх структурных падраздзяленняў універсітэта. Дэлегаты заслухалі справаздачу прафсаюзнага камітэта аб рабоце, праведзенай за апошнія 5 гадоў, а таксама справаздачу рэвізійнай камісіі аб выніках фінансавай дзейнасці прафкама.

У сваім дакладзе старшыня прафкама дацэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Яўген Пятровіч Туромша адзначыў, што дзякуючы калектыўнаму дагавору, падпісанаму паміж прафкамам супрацоўнікаў і рэктаратам БДУ ў чэрвені 2004 г., удаецца вырашаць многія важныя пытанні:

— дадатковыя выплаты супрацоўнікам БДУ да чарговых адпачынкаў, дня нараджэння БДУ, аказанне матэрыяльнай дапамогі на набыццё гародніны і да Новага года;

— 50%-е зніжэнне кошту навучання па любых формах дзецям супрацоўнікаў БДУ;

— частковае зніжэнне кошту навучання па любых формах штатным супрацоўнікам БДУ;

— прадастаўленне адпачынку паводле пісьмовай заявы работніка без захавання заробку па сямейных абставінах і іншых паважных прычынах;

— прадастаўленне жанчынам, якія выхоўваюць аднаго ці больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, паводле іх заяваў штомесяц аднаго вольнага дня з захаваннем штомесячнага заробку і г.д.

Закрануўшы тэму кантрактаў, Я.П.Туромша падтрымаў пазіцыю Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і ЦК прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ў пытанні гарантыяў абароны правоў і законных інтарэсаў работнікаў. Вялікую ўвагу старшыня прафкама ў сваім дакладзе надаў паляпшэнню жыллёвых умоваў супрацоўнікаў БДУ. Каб вырашыць гэтую праблему, прафкам з Саветам рэктараў і Саветам старшыняў прафкамаў ВНУ Беларусі накіраваў ліст на імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, каб стварыць жыллёва-будаўнічыя кааператывы для супрацоўнікаў мінскіх ВНУ. І паводле даручэння кіраўніка дзяржавы, будуць сфармаваныя 3 ЖБК у раёнах Сухарава-4, Сухарава-5 і па вул. Купрэвіча.

У сваім дакладзе Я.П. Туромша закрануў таксама такі кірунак дзейнасці прафсаюзнага камітэта, як санаторна-курортнае лячэнне: у САК "Брыганціна" сёлета адпачылі і ўмацавалі здароўе 383 дзіцяці супрацоўнікаў БДУ і 413 супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў. Не абмінуў увагай прафсаюзны лідэр і такія сферы, як спартыўна-масавая работа (у БДУ дзейнічае штогод 16—18 груп здароўя па 9 відах спорту, якія наведваюць да 500 супрацоўнікаў), культурна-масавая дзейнасць і дапамога сям'і і школе: наш універсітэт — адзіная сярод усіх ВНУ Беларусі выдае навагоднія падарункі дзецям да 14 гадоў.

У рабоце канферэнцыі прыняў удзел і выступіў з прамовай рэктар БДУ прафесар В.І.Стражаў. Ён прааналізаваў дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі універсітэта і расказаў аб бліжэйшых перспектывах развіцця БДУ. У рабоце форуму таксама прынялі ўдзел старшыня Цэнтральнага камітэта Рэспубліканскага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Т. І. Чобатава і старшыні прафсаюзных камітэтаў шэрагу ВНУ г. Мінска: Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта, Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта.

На канферэнцыі быў абраны новы склад прафсаюзнага камітэта. Старшынёй прафсаюзнага камітэта БДУ зноў выбраны Я.П. Туромша.

Алена ШЫБУТ

Чытайце нас у Інтэрнэце

Газета «Беларускі універсітэт» мае свой сайт **(www.gazeta.bsu.by).** Вы можаце даведвацца пра новыя матэрыялы яшчэ да таго, як выйдзе свежы нумар выдання. Акрамя таго, на сайце вы знойдзеце больш поўныя версіі матэрыялаў газеты.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

30 лістапада 2004 года

Падпісана да друку 29.11.2004 г.
Ум. друк. арк. 2
Зак.1126. Тыраж 1000 экз.

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК

Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by www.gazeta.bsu.by